

КАГО РЫХТУЮЦЬ У ЛІЦЭІ МУС?

5

МУЗЕІ ЗАПРАШАЮЦЬ НА ЎРОКІ...

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЖНІЎНЯ 2022 г. СУБОТА № 168 (29790)

## КОРАТКА

● **Дзяржлесахова пераходзіць на кругласутачнае дзяжурства з-за павышанай пагрозы надзвычайных сітуацый.**

● У НАН Беларусі будзе свой універсітэт.

● **Імянныя чэкі «Маёмасць» будуць знаходзіцца ў абароце да 31 снежня 2025 года.**

● У Шклове пасля рэканструкцыі адкрыўся помнік загінулым у гады вайны мірным жыхарам.

● **У мінскім метро з 29 жніўня змяняецца расклад цягнікоў. Інтэрвал руху ў ранішнія гадзіны пік складзе дзве хвіліны, у вячэрнія гадзіны пік — дзве з паловай хвіліны.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У Беларусі ўсяляк падтрымліваюць моладзь і маладзёжныя ініцыятывы. Па рашэнні кіраўніка дзяржавы ў нас зацверджаны стыпендыі, якія выдзяляюцца самым дастойным. Актыўна развіваецца грамадскі рух. Развіваем партнёрскія адносіны з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыяй. Мы захавалі ўсе ключавыя аспекты ўзаемадзеяння, якія былі эфектыўныя і якія аб'ядноўвалі нашу моладзь. Ёсць валанцёрскі рух, садзейнічанне маладым сем'ям. Ствараем усе ўмовы, каб чалавек мог развівацца. Важна на розных пляцоўках дзяліцца пазітыўнымі практыкамі. Чакаем прапаноў моладзі, што нам яшчэ ў рамках ЕАЭС і СНД неабходна зрабіць, каб інтэграцыя развівалася».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ТРЭБА РАСПРАНАЦЦА, НАПРУЖВАЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Мінскі механічны завод імя С. І. Вавілава — кіруючую кампанію холдынга «БелОМА». Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з сучаснымі распрацоўкамі оптыка-электроннага прыборабудавання, перспектывамі развіцця высокадакладнай тэхнікі айчыннай вытворчасці.**



Фота БелТА.

Холдынг «БелОМА» (Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне) з'яўляецца ўніверсальным шматпрофільным аб'яднаннем, якое спецыялізуецца на распрацоўцы, канструяванні і вытворчасці лазерных, оптыка-электронных і оптыка-механічных прыбораў і сістэм. Разам з прадукцыяй аптычнага профілю прадпрыемства выпускае кампаненты тармазных сістэм вялікагрузных аўтамабіляў, бытавыя прыборы ўліку газу, абагравальнікі для агульнага і лакальнага абагрэву памяшканняў, тавары народнага спажывання і іншае.

Нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс і санкцыі, прадпрыемства развіваецца. Аб гэтым сведчыць хоць бы той факт, што інавацыйная прадукцыя «БелОМА» экспартуецца больш як у 30 краін свету. Больш канкрэтна аб фінансава-эканамічным стане холдынга беларускаму Прэзідэнту далажыў генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр Мароз. Ён расказаў, што аб'ёмы вытворчасці растуць, запазычанасці па заробках няма, сацыяльныя абавязацельствы перад супрацоўнікамі такса-ма выконваюцца. Усе прадпрыемствы холдынга, па словах Аляксандра Мароза, працуюць стабільна, з чыстым прыбыткам, выконваюць усе паказчыкі. Ён адзначыў, што большую частку прадукцыі — а гэта 65 % — прадпрыемствы «БелОМА» пастаўляюць на экспарт, пры гэтым палову з гэтага — у краіны далёкага замежжа.

СТАР. 2

# З лучнікоўскіх палеткаў



**Дваццаць два гады працуе ў сельгаспрадпрыемстве «Лучнікі» Слуцкага раёна Ігар ЮРЧЫК, трынаццаць з іх — у час уборачнай кампаніі на зерне-сушылцы ЗСК-40. Яна знаходзіцца на выездзе з вёскі-сядзібы гаспадаркі, сюды прывозяць спелае збожжа з палеткаў ад вёсак Серагі, Варкавічы, Бязверхавічы, Лучнікі. Юрый кантралюе вільготнасць зерня перад сушкай.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Інклюзію

# ГІСТОРЫЮ МОЖНА... ПАМАЦАЦЬ

У Гродне пачалі праводзіць тактыльныя экскурсіі. Ці спрыяльны старажытны цэнтр для інклюзіўнага асяроддзя?



**Людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а ў прыватнасці з праблемамі зроку, не так часта можна ўбачыць на гарадскіх вуліцах. Але апошнім часам у старажытным цэнтры сустракаюцца нават цэлыя групы экскурсантаў, якія знаёмяцца з горадам навобмацак. Тактыльныя экскурсіі ўпершыню зладзілі работнікі гродзенскай бібліятэчнай сістэмы.**

СТАР. 9

# «ТРЭБА РАСПРАНАЦЦА, НАПРУЖВАЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ»

### «Вышэй за сусветны ўзровень»

Прэзідэнт пацікавіўся адным з найбольш перспектыўных праектаў — стварэннем сістэм ABS і EBS тармазнога прывада велікагрузных аўтамабіляў. Праектам прадугледжана вытворчасць новых інавацыйных імпартазамяшчальных вырабаў для камплектацыі не толькі велікагрузаў, але і аўтобусаў, тралейбусаў, сельскагаспадарчай тэхнікі. Кірунак вельмі запатрабаваны. «Расія ўся ў чарзе стаіць, — заўважыў Аляксандр Мароз. — Мы канкурыравалі з імі, але цяпер з'явілася ніша, таму наша задача — гэтую нішу заняць».

«Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло», — каторы раз рэзюмаваў беларускі лідар, звярнуўшы ўвагу на тое, што адным з прадпрыемстваў холдынга з'яўляецца «Зеніт», дзе ў свой час стварылі знакамітыя фотаапараты. Цяпер жа, па словах кіраўніка дзяржавы, папулярнасцю карыстаецца імпартная тэхніка. У сувязі з гэтым Прэзідэнту расказалі, што неўзабаве завод «Зеніт», які знаходзіцца ў Вілейцы, атрымае новае дыханне. Рэалізацыя буйнога праекта запланавана і ў Рагачове. Там будуць створаны новыя высокавытворчыя працоўныя месцы, не абыдзецца і без сучасных тэхналогій. Развіваць вытворчасці ў малых гарадах — такую задачу ставіць перад сабой кіраўніцтва прадпрыемства.

Прэзідэнту прадэманстравалі асноўную прадукцыю, на якой спецыялізуецца прадпрыемства, — аптычныя вырабы. Оптыка складае 51 % ад агульнага аб'ёму вытворчасці. «Аднак гэта вытворчая оптыка, — удакладніў кіраўнік холдынга. — Калі сюды яшчэ дабавіць навуку, то аптычнай (прадукцыі. — **«Зв.»**) будзе звыш 60 %».

Азнаёміўся кіраўнік дзяржавы і з вытворчым працэсам. «Грошы трэба ўкладваць у тыя кірункі, дзе ў нас ёсць кампетэнцыі, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Трэба тут паглыбляцца, пашырацца. Калі ёсць попыт, трэба гэта ствараць і даводзіць да сусветнага ўзроўню, вышэй за сусветны ўзровень, бо на сусветным вы і так знаходзіцеся. Гэта цяпер тэхніка нумар адзін». Беларускі лідар назваў прадпрыемства супервытворчасцю, дзе працуюць слесар і акадэмік у адной звязцы.

### «Суверэнітэт і незалежнасць — рэчы непарушныя»

Пасля агляду прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з журналістамі. Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, Прэзідэнт пракаментаваў нядаўнія заяўленні Олафа Шольца пра размову з Уладзімірам Пуціным. Канцлер Германіі расказаў, што Прэзідэнт Расіі нібыта адмаўляў незалежнасць Беларусі і Расіі. «Шольц — гэта пацан, які нічога не разумее і разумець не хоча ў палітыцы. Такія размовы паміж кіраўнікамі дзяржаў маюць абсалютна закрыты характар. Аб размове можна казаць і яе апублікаваць толькі са згоды чалавека на тым канцы провада. Ён павінен быў дамовіцца з Пуціным. Памятайце, Макрон перад журналістамі «піярыўся», што ён там сказаў Пуціну. Гэта драбната, так нельга», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што на такія фэйкі не звяртае ўвагі, асабліва ведаючы пункт гледжання Прэзідэнта Расіі. «Суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы — рэчы непарушныя. Усё. Калі пытанне датычыцца нашай незалежнасці, я з гэтымі людзьмі нават не размаўляю, якую б яны дзяржаву ні прадстаўлялі. Так было з амерыканцамі, з французамі і будзе заўсёды», — канстатаваў беларускі лідар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Журналісты не змаглі пакінуць без увагі і ўкраінскую тэму. Нагадаем, на гэтым тыдні Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Украіну з Днём Незалежнасці, што выклікала зусім не святочную рэакцыю. Адзін з дэпутатаў нават стаў пагражаць фізічнай расправай, за што Генеральная пракуратура Беларусі ўзбудзіла ў дачыненні да яго крымінальную справу. Прэзідэнт адзначыў, што на гэта ён нават не звярнуў увагі. І падкрэсліў, што не мог не павіншаваць украінскі народ, паколькі адчувае да Украіны цёплыя пачуцці — тут аб'ядналася і асабістае, і дзяржаўнае. «Мае карані прапрадзедаў закапаны паміж Чарнігавам і Кіевам. Прозвішча само пра сябе гаворыць, дзякуй богу захавалі. Украіна — гэта нашы суседзі. Іх не выбіраюць, гэта ад Бога. А раз ад Госпада Бога, мы павінны ставіцца да іх адпаведна. Гэта нашы людзі, гэта славяне, мы ўсе ад аднаго кораня. Я заўсёды захапляўся Украінай. Я вельмі добра ведаю заходнюю Украіну, я там служыў. Асабіста ў мяне вельмі добрыя адносіны да ўкраінцаў», — падзяліўся кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ўкраінцы — ніякія не «нацыкі». «Нацыкі» — гэта тыя, хто зверху, пачынаючы ад тых, хто курыць, нюхае, п'е і потым вякае з экранаў тэлевізараў», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўжо на другі дзень канфлікту Расіі і Украіны ён ініцыяваў мірныя перагаворы. «З Зяленскім як з дзіцем вазіўся», — сказаў ён. Але перагаворны працэс зайшоў у тупік. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на тое, што нядаўна Злучаныя Штаты паабяцалі аказаць Украіне ваенную дапамогу на $3 млрд. «Для таго, каб украінцы гінулі і ў далейшым», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што вайна хутка скончыцца, а адказваць камусьці давядзецца. І не толькі маральна. Таму, па яго словах, трэба на кагосьці гэтую адказнасць перакласці. «Вось яны ўсім светам спрабуюць гэта зваліць на Лукашэнку і Пуціна. Не атрымаецца. Гэта толькі пачатак. Мы вось, здаецца, столькі перажылі з 2020 года, столькі нацярпеліся. Самае цяжкае — наперадзе. Нам трэба завесціся зараз, выкарыстоўваць момант, заняць нішы і зрабіць усё, каб працавала эканоміка і не было вайны. Вось што вельмі важна цяпер. Гэта мая задача, мая мэта. Бачу, што пацяху мы яе дасягаем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### «Будучыня Еўропы толькі з намі, з Расіяй»

Аляксандр Лукашэнка выказаў сваё меркаванне і наконт сітуацыі ў Еўрапейскім саюзе. «Дастатку ў іх ужо не будзе. Ім зараз давядзецца плаціць па рахунках і на ўсю катушку», — звярнуў увагу ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, калі раней Расія прадавала Германіі і іншым краінам ЕС газ на 50 працэнтаў танней, чым магла, ФРГ і іншыя краіны за кошт гэтага былі «ў шакаладзе» — значыць багатымі. «Цяпер «дурніца» скончылася. Больш за тое, «уклаліся» ва ўкраінскую авантуру, пандэмія, лакдаўны, раскідванне з верталёта грошай. Вось яно зараз усё вылазіць. Праблем шмат, і багацця ў іх сапраўды больш не будзе. Трэба распранацца, напружвацца і працаваць», — канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што зараз ідзе перафарматаванне свету, і яго наступствы мы ўбачым у найбліжэйшы час. Ён нагадаў, што нядаўна палякі прапанавалі распусціць Еўрапейскі саюз і адмовіцца ад еўра. Аляксандр Лукашэнка назваў гэта марай ЗША. «Канфлікт Еўропы і Амерыкі пачаўся тады, калі з'явілася альтэрнатыўная валюта — еўра. Таму ўсё толькі пачынаецца. Будучыня Еўропы толькі з намі, з Расіяй. Усе рэсурсы тут. Бярыце, пераварвайце, разам будзем жыць і працаваць — і Амерыка знікне з радараў. Вось яны гэтага баяцца», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

У размове з Прэзідэнтам журналісты закранулі выгрузку ваеннай тэхнікі ЗША ў рамках аперацыі «Атлантычная рашучасць». Верталёты і абсталяванне плануюць перакінуць у тым ліку і ў краіны Усходняй Еўропы. «Яны павінны разумець, што ніякія верталёты, самалёты, калі яны пойдуць на абвастрэнне, іх не выратуюць. Мы некалі з Пуціным заявілі, што пераабсталюем і беларускія самалёты СУ-25 для таго, каб яны маглі несці ядзерную зброю. Усё гатова! Таму няхай прывозяць. Я іх папярэдзіў: не дай бог, нейкая сур'ёзная правакацыя супраць Беларусі — мэты ў нас вызначаны. Цэнтры прыняцця рашэнняў, мы іх ведаем. Я не пагражаю нікому», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што падстаў для хвалявання няма. Па яго словах, яны глядзяць за намі, а мы глядзім за імі.

### «Каб зарабіць, трэба варушыцца»

Адказваючы на пытанне, ці гатовы сёння людзі на месцах працаваць і прымаць рашэнні, Прэзідэнт заўважыў: «Калі нехта не гатовы — прымусім, не можа — навучым». І парэкамендаваў рабіць, як ён, — працаздольнасці, любові да зямлі ў кіраўніка дзяржавы сапраўды варта павучыцца. «І калі вы правільна заўважылі, што я «бегаю» па краіне і рухаюся, то я не дазволю камусьці проста скласці рукі і сядзець, — сказаў ён. — І разумныя людзі, заўважыўшы гэта, пабягуць следам. Хто адстане, «упадзе», падымем — на іншую пасаду перавядзём. Хто будзе шкодзіць — самі ведаеце, што будзе».

Беларускі лідар перакананы: людзей, якія маюць дачыненне да ўборкі ўраджаю, трэба заахвочваць. «Мы адмовіліся рабіць гэта, як раней, на ўзроўні Прэзідэнта ў адной пэўнай кропцы, — нагадаў ён. — Кожная вобласць выбірае раён, кожны раён — гаспадарку, і там праводзіць «Дажынкі». Такім чынам мы прыводзім у парадак два дзясяткі кропак: гаспадаркі, аграгарадкі, раёны, вобласць».

Кіраўнік дзяржавы цвёрда перакананы: «Калі нехта хоча зарабіць, то трэба варушыцца». І магчымасцяў у нашай краіне для гэтага шмат. Седзячы ў тэлефоне, чакаць, што вырасце бульба, — сама меней абсурдна. Працаваць, па словах Аляксандра Лукашэнкі, прымушаюць нас і санкцыі. Аднак, нягледзячы на гэта, заўважыў Прэзідэнт, жывём мы нармальна. «Дай бог, каб і далей так было, — дадаў ён. — Мы беларускі народ не кінем. Будзем бегаць, але гарантуем сваю бяспеку. І харчовую ў тым ліку. У нас усё ёсць, што нам неабходна. Мы спажывём унутры краіны столькі, колькі прададзім. Больш чым сем мільярдаў долараў мы атрымаем толькі за харчаванне. А за гэтыя грошы купім і газ, і нафту, і ўсё астатняе».

Журналісты заўважылі, што толькі за апошні месяц кіраўнік дзяржавы наведаў практычна ўсе рэгіёны краіны. За выключэннем Гомельскай вобласці, — удакладніў Прэзідэнт і адразу анансаваў, што ў найбліжэйшы час пабывае і там. Не сакрэт, што такія візіты кіраўніка дзяржавы трымаюць людзей у тонусе, аднак усё роўна яны хочуць, каб да іх прыехаў Прэзідэнт. Калі глядзець аб'ектыўна, пабываць усюды беларускі лідар не можа, таму, як ён сам нядаўна казаў, перш за ўсё едзе туды, дзе можа ўбачыць нешта новае. Безумоўна, нямала сярод гэтага і таго, што здзіўляе Прэзідэнта, хоць, як ён сам прызнаецца, яго ўжо цяжка здзівіць пасля столькіх гадоў работы на гэтай пасадзе. Прадукцыя «БелОМА» — акурат тое, што і здзівіла, і парадавала. «Тут робяць унікальныя рэчы. Увесь свет стаіць да іх у чарзе, і гэта нягледзячы на санкцыі», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Таксама Прэзідэнт прывёў у прыклад будаўніцтва калгасаў з нуля, што давялося ўбачыць падчас рабочай паездкі ў Мядзельскі раён, Беларускую атамную станцыю. «Ніколі гэтым не займаліся, а сёння самі з невялікім удзелам Расіі ў любым месцы можам пабудаваць такую атамную станцыю», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. І нагадаў пра яшчэ адзін буйны праект — Беларускую нацыянальную біятэхналагічную карпарацыю, які адназначна прымушае здзіўляцца кіраўнікоў іншых дзяржаў, бо тое, што ствараецца на гэтым прадпрыемстве, могуць толькі чатыры краіны ў свеце. «Такіх прадпрыемстваў патрэбна хаця б адно ў пяцігодку, — рэзюмаваў і, можна меркаваць, паставіў задачу беларускі лідар. — У астатнім трэба ўкладваць у развіццё таго, што ёсць».

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

**У тэму**

### Аляксандр МАРОЗ: «У НАС ЁСЦЬ АДПАВЕДНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ»

Як расказаў журналістам генеральны дырэктар холдынга Аляксандр Мароз, у 2021 годзе і ў першай палове 2022-га прадпрыемства выканала большасць даведзеных паказчыкаў і ўпэўнена глядзіць у канец гэтага года. «Мы ўзялі на сябе павышаныя паказчыкі па экспарце ў гэтым годзе, у разы будзем апярэджваць тыя тэмпы, якія былі загадзя запланаваны. Год ацэньваю паспяхова», — сказаў ён.

Таксама Аляксандр Мароз расказаў, што холдынг «БелОМА» прыступіў да рэалізацыі праекта па імпартазамяшчэнні, які сёння вельмі актуальны на беларускім і расійскім рынку. Гаворка ідзе аб комплекснай вытворчасці тармазной сістэмы для велікагрузных аўтамабіляў, тэхнічных канвеераў Саюзнай дзяржавы. «У нас ёсць адпаведныя кампетэнцыі ў гэтых пытаннях. Але нам трэба павялічыць лакалізацыю. Намі асвоена ўжо 70 працэнтаў усёй сістэмы, застаецца асвоіць яшчэ 30, каб ажыццяўляць камплектную пастаўку тармазных сістэм на аўтамабільныя рынкі. Гэта нам пад сілу», — адзначыў дырэктар холдынга.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША папярэдзілі Украіну аб скрышальным паражэнні пры контрнаступленні

**Узброеныя сілы Украіны пацерпяць поўнае паражэнне пры спробе контрнаступлення на поўдні рэспублікі і Данбасе. Аб гэтым піша эксперт у галіне бяспекі Роберт Фарлі.**

«Існуюць важкія прычыны, па якіх Украіна павінна супраціўляцца заклiку Захаду да больш хуткіх дзеянняў», — лічыць аўтар. Фарлі адзначыў, што з вялікай верагоднасцю наступленне ўкраінскай арміі прывядзе да таго, што будуць выяўлены слабыя месцы абароны УСУ, і да страты новых тэрыторый у выніку контрудара расійскіх войск. Ён таксама дадаў, што паражэнне Украіны можа адбіць у Захада жаданне пастаўляць краіне новыя партыі ўзбраення.

Раней аглядальнік нямецкай газеты Welt Крыстаф Шыльц выказаў меркаванне, што Украіне варта прыняць «горкую праўду» аб страце Данбаса ў найбліжэйшы час і бесперспектыўнасці спроб контрнаступлення на Херсон.

### El Mundo: тысячы ўкраінскіх дзяцей у Еўропе рызыкуюць трапіць у рукі гандляроў людзьмі



**Бязладны паток бежанцаў з Украіны ў краіны Еўропы стварае спрыяльныя ўмовы для гандляроў людзьмі і злачынных груповак, якія заганяюць людзей у сексуальнае рабства. У асаблівай небяспецы аказаліся ўкраінскія дзеці. Аб гэтым гаворыцца ў артыкуле іспанскай газеты El Mundo.**

Каля дзесяці мільёнаў бежанцаў пакінулі Украіну за апошнія шэсць месяцаў з-за ваеннага канфлікту. У 90 працэнтах выпадкаў гэта жанчыны і дзеці, таму гуманітарныя і няўрадавыя арганізацыі папярэджваюць аб рызыках, асабліва для непаўналетніх. Па даных ЮНІСЕФ, толькі за першы месяц канфлікту Украіну пакінулі 1,5 млн дзяцей. Фонд ААН папярэджвае, што гандляры людзьмі могуць карыстацца гэтай сітуацыяй.

Рызыкі звязаныя з тым, што ў некаторых краінах ЕС няма строгага пагранічнага кантролю, уліку мігрантаў і кантролю за тым, хто прыбывае з Украіны. Упраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў выказала непакой з гэтай прычыны і папярэдзіла ўкраінцаў аб існаванні злачынных груповак, якія абяцаюць бясплатны транспарт, размяшчэнне, працу і іншую дапамогу, а затым выкарыстоўваюць людзей у сваіх мэтах.

ЮНІСЕФ заклікала ўрады еўрапейскіх краін, якія мяжуюць з Украінай, устанавіць эфектыўныя сістэмы кантролю і абароны непаўналетніх, якія перасякаюць граніцу, і хутка ідэнтыфікаваць дзяцей без суправаджэння дарослых.

Жніво-2022

# НАЙЛЕПШЫЯ — ПЕРШЫЯ!

**Сельскагаспадарчае прадпрыемства «Мазалавагаз» УП «Віцебскаблгаз» першым у паўночным рэгіёне краіны завяршыла ўборачную кампанію. Урачыстае свята апошняга снапа прайшло ў Віцебскім раёне, даўшы дажыначны старт гаспадаркам Віцебшчыны.**



Вопытныя аграрыі аднаго з найлепшых у краіне прадпрыемстваў «Мазалавагаз» унеслі важкі ўклад у агульны каравай вобласці — 6,8 тысячы тон. Захаванне тэхналогій на ўсіх этапах палявых работ дало высокі вынік — сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур склала 58 цэнтнераў з гектара, а толькі зерневыя далі 63,4 ц/га. На ўборцы «золата палёў» былі задзейнічаны сем камбайнаў і 11 машын, але нават пасля канца жніва ў гаспадарцы не губляюць апошнія сонечныя хвіліны — чатыры камбайны дапамагаюць суседняму агракомплексу «Адраджэнне» ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка», і ўжо вопытныя мазалаўскія механізатары намалацілі на палях птушкафабрыкі звыш тысячы тон збожжа.

«Паважаныя аграрыі, ваша перамога — гэта карпатлівая, штодзённая адданая праца. Высокі агульны вынік складаецца з поспеху кожнага з вас: пачынаючы ад механізатара і жывёлавода да генеральнага дырэктара. Выказваю вам падзяку ад усёй вобласці і ад нашай краіны, жадаю моцнага здароўя і спасціжэння новых працоўных вяршынь», — звярнуўся да ўдзельнікаў свята **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

Прафесіяналізм і любоў да зямлі мазалаўскіх аграрыяў на «Дажынках» былі адзначаны ўзнагародамі розных узроўняў. Камбайнеры, вадзіцелі, аграномы — ніхто ў перыяд уборачнай не застаўся ўбаку ад агульнай для ўсіх беларусаў справы — збіраць хлеб. Без выхадных, ад відна да відна кожны на сваім месцы яны шчыравалі дзеля забеспячэння харчовай бяспекі нашай краіны. Адзін з іх — легенда прадпрыемства — камбайнер Сяргей Мелдэрэс, які штогод паказвае найвышэйшы вынік па намалоце ў гаспадарцы. Сёлета ён намалаціў амаль 2,2 тысячы тон збожжавых, зернебабовых і крыжакветных культур. Яшчэ чатыры механізатары ўзялі тысячную мяжу.

«Хлеб — усяму галава. Гэта сапраўды так, спрадвеку нашы продкі займаліся земляробствам, гэта слаўная справа сёння асвойвае новыя метады і фарматы, а сельская гаспадарка з'яўляецца адной з самых найважнейшых і прэстыжных прафесій. Шчыры дзякуй за вашу нялёгкую працу, за высокі вынік. Перад спецыялістамі «Мазалавагаза» адкрываюцца вялікія перспектывы, вам ёсць куды імкнуцца. Спадзяёмся, што ў наступным сезоне вашы вынікі будуць яшчэ лепшымі», — адзначыў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ.**



З цёплымі віншаваннямі і шчырымі песнямі на першых у вобласці «Дажынках» віталі найлепшых спецыялістаў. Ад імя Гарадоцкага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа, для выпускнікоў якога «Мазалавагаз» становіцца першай кропкай прафесійнага станаўлення, кіраўніцтву прадпрыемства паднеслі святочны торт уласнага прыгатавання з сімваламі жніва.

Пасля афіцыйнай фінальнай кропкі ўборачнай работы ў аграрыяў хапае. Зараз актыўна вядзецца ўзворванне плошчаў, сяўба азімых — ужо засеяна звыш 600 гектараў рапсу, а з 1 верасня аграрыі возьмуцца за азімую пшаніцу. У сярэдзіне верасня яны будуць збіраць каралеву палёў — кукурузу. Амаль усе культуры перапрацоўваюць на корм жывёле, а яшчэ ў наступным годзе ў планах мазалаўскіх спецыялістаў — асваенне соі.

Цяпер, па словах **старшыні Мазалаўскага сельвыканкама Леаніда ДУБІНЫ,** механізатары аказваюць дапамогу насельніцтву ва ўборцы збожжа на асабістых участках, на сёння з дапамогай вопытных камбайнераў ужо ўбрана звыш 140 такіх. Машыніст экскаватара філіяла ВУ «Полацкгаз» Валерый Грузневіч працуе ў сельскай гаспадарцы 36 гадоў. За столькі часу да механізатара з незгасальным аптымізмам ужо прывыклі мазалаўчане, таму і чакаюць Валерыя Васільевіча ў жніўні на дапамогу.

Па словах старшыні Віцебскага аблвыканкама, паўночны рэгіён упэўненымі крокамі набліжаецца да запаветнага мільёна тон зерня. Для гэтага створаны ўсе неабходныя ўмовы: тэхніка не прастойвае, гаспадаркі дапамагаюць адна адной. Але галоўным рэсурсам у дасягненні высокага выніку з'яўляюцца прафесіяналы, якіх, гледзячы на вытворчыя дасягненні, на Віцебшчыне багата.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота аўтара.**

Армейскія гульні — 2022

# НАДЗЕЙНАЯ СУВЯЗЬ

## У рамках «Армейскіх міжнародных гульняў — 2022» у Мінску прайшлі спаборніцтвы ваенных сувязістаў «Упэўнены прыём»

**Заключны этап — «Ваенізаваная эстафета» — адбыўся на палігоне 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, а для беларускага боку гэты турнір ужо трэці па ліку ў ролі гаспадароў.**

Усяго конкурс быў падзелены на пяць этапаў: «Упэўнены прыём», «Радыёабмен», «Радыёарыентаванне», «Ваенізаваная эстафета», а таксама «Работа на абсталяванні ІТ-структуры». У спаборніцтвах на апошнім этапе прымалі ўдзел сувязісты з Беларусі, Расіі, В'етнама і Узбекістана.

**Начальнік сувязі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Алег МІШЧАНКА** перад стартам апошняга этапу расказаў аб сур'ёзным узроўні спаборніцтваў:

— У конкурсе сувязістаў «Упэўнены прыём» у гэтым годзе ўдзельнічае рэкордная колькасць каманд — удзел у спаборніцтвах пацвердзілі 12 краін. «Ваенізаванай эстафеце» сёлета нададзена больш дынамікі і відовішчнасці. Упрыгожаннем гэтага спаборніцтва стаў удзел дзяўчат: былі выстаўлены чатыры жаночыя каманды, а перамогу атрымала наша зборная.

Удзельнікі конкурсу павінны былі здзейсніць праезд на камандна-штабной машыне (КШМ) з перааддоленнем паласы перашкод. Затым адбывалася разгортванне КШМ і настройванне радыёстанцыі ў адпаведнасці з атрыманымі радыёданымі. Потым удзельнікі прыступалі да стральбы па мішэнях.

Прадстаўнік расійскага боку ў судзейскай калегіі капітан 3-га рангу **Наталля КАРАСІК** засталася пад уражаннем ад спаборніцтваў:

— Я вельмі люблю Беларусь, з задавальненнем прыязджаю сюды. «Ваенізаваная эстафета» — самая відовішчная частка спаборніцтваў, дзе трэба паказаць майстэрства і найлепшыя навыкі.

Ваеннаслужачыя пад крычалкі сваіх таварышаў па камандзе, якія не прымаюць удзел у эстафеце, і падтрымку салдат з іншых каманд паказалі максімум магчымасцяў. Некаторым, як зборнай Узбекістана, дзесьці не пашанцавала з тэхнікай, але гэта толькі згуртавала.

Сяржант 3-й ступені **Сунатбек ХАМРОЕЎ** з узбекскай каманды ўдзельнічае ва «Упэўненым прыёме» другі год запар. Тады яго экіпаж паказаў нядрэнныя вынікі для пачатковага, але адразу ж былі вызначаны мэты на этап у 2022 годзе — трапіць у медалі.



Фота БелТА.

Сваё заданне выканаў:

— На трэніроўках былі паказчыкі і лепей, але сёння не пашанцавала з рухавіком — глухла машына і трэба было павольна ехаць, каб яна не спынілася. Нягледзячы на гэтыя непаладкі на старце, каманда не страціла баявога духу. Наадварот, няўдача надала матывацыі. На працягу года нашы вайскоўцы выконваюць свае непасрэдныя абавязкі, а да «Упэўненага прыёму» рыхтаваліся ў вольны час, на гэта спатрэбілася каля чатырох месяцаў. У Беларусі вельмі прыемны клімат. Вядома, для вас зараз спякотнае надвор'е, але ў нас ва Узбекістане даходзіць да 40 градусаў. Таму нам было куды лягчэй рыхтавацца і выступаць. Нас падтрымлівалі гледачы і сапернікі з іншых каманд — усё гэта дадавала ўпэўненасці ў сваіх сілах.

Малодшы лейтэнант **Дзмітрый КУХАРОНАК** з беларускай каманды з'яўляецца адным з самых вопытных удзельнікаў «Упэўненага прыёму», аднак сур'ёзныя выпрабаванні не дазваляюць расслабіцца ні на секунду.



— Вядома, дапамагае вопыт ад пройдзеных мінулых спаборніцтваў, але напружанне і адказнасць за вынік не знікаюць. Я лічу, што наш экіпаж выступіў годна. Складаней за ўсё, мусіць, было ўдзельнічаць у эстафеце. Я павінен быў праехаць паласу перашкод і разгарнуць радыёстанцыю, а затым каманда прыступала да стральбы. З улікам таго, што пульс зашкальваў, трэба было хутка сканцэнтравацца. У гэтым годзе сапернікі з іншых краін выставілі сабраныя і моцныя саставы, і я лічу, што ў іх усё атрымалася. Адным словам, сапернікі дастойныя. Мы заўсёды рады бачыць на нашай беларускай зямлі замежныя каманды, — сказаў на заканчэнне малодшы лейтэнант.

Пасля завяршэння спаборніцтваў з афіцыйным закрыццём конкурсу судзейская камісія пачала падлік вынікаў. Пераможцамі спаборніцтваў «Упэўнены прыём» АрМІ-2022 сярод ваенных сувязістаў сталі каманды з Беларусі і Расіі. Калі на апошнім этапе, «Ваенізаванай эстафеце», роўных не было зборнай Расіі (100 балаў), то ў агульным заліку нашы земляк сабралі з суседзямі аднолькавую колькасць ачкоў.

З поспехаў беларускіх ваенных на «Армейскіх міжнародных гульнях — 2022» трэба адзначыць «бронзу» на конкурсе «Дарожны патруль» ва Узбекістане і «серабро» сярод мотастралкоў у «Суворaўскім націску» ў Кітаі — там залатыя медалі ўзялі гаспадары спаборніцтваў. А на другім этапе конкурсу «Сталёвая магістраль» нашай зборнай не было роўных. Конкурс прайшоў на тэрыторыі палігона 30-й асобнай чыгуначнай брыгады ў Слуцкім раёне.

**Выніковы п'едэстал пасля пяці этапаў конкурсу «Упэўнены прыём»:**

1-е месца — Беларусь і Расія (461 бал);

2-е месца — В'етнам і Узбекістан (363 балы);

3-е месца — Лаос (116 балаў).

**Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ** адзначыў, што конкурс садзейнічае абмену вопытам і методыкамі выканання задач па забеспячэнні сувязі:

— Конкурс аб'ядноўвае ваеннаслужачых краін-удзельніц. Вопыт узброеных канфліктаў апошніх гадоў паказаў: без сувязі не будзе поспеху ў нашай прафесіі. «Упэўнены прыём» набірае міжнародную папулярнасць для ўзброеных сіл, а для беларускіх вайскоўцаў удзел у «Армейскіх гульнях» стымулюе тэмп баявой падрыхтоўкі па новых напрамках. У нас кожны год павялічваецца аб'ём новых тэхналогій у спаборніцтвах.

**Аляксей КАРПУК.**

# Прысягнулі Радзіме



**На вернасць Радзіме 26 жніўня прысягнулі курсанты-першакурснікі Акадэміі МУС. Урачыстае мерапрыемства адбылося на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску.**









Асаблівасцю сёлетняй уступнай кампаніі быў агульны конкурс па ўсіх спецыяльнасцях. Пры падачы заявы абітурыент паведамляў, якія спецыяльнасці ён разглядае ў парадку прыярытэту. Многія імкнуліся пазначыць максімальную колькасць спецыяльнасцяў, каб дакладна паступіць у Акадэмію МУС.

Па словах **міністра ўнутраных спраў Івана КУБРАКОВА**, сёлета конкурс быў самы высокі за апошнія пяць гадоў. Па звестках прэс-службы Акадэміі МУС, на 440 бюджэтных месцаў дзённай формы навучання прэтэндавалі 734 абітурыенты. Больш за тое, пасля курса маладога байца адток курсантаў быў мінімальны.

Іван Кубракоў падкрэсліў, што ведамства робіць усё магчымае, каб працэс навучання быў цікавы, актуальны і карысны:

— Курсанты будуць займацца спортам, навукай па кірунках службовай дзейнасці. Таксама адмысловая ўвага аддадзена навучанню кібербяспецы, развіццю высокіх тэхналогій.

Трэба адзначыць, што сёлета дысцыпліна «Процідзеянне кіберзлачынствам і камп'ютарная разведка» будзе вывучацца на ўсіх факультэтах незалежна ад спецыяльнасці.

Падчас прысягі ў стройных радах курсантаў можна было заўважыць і дзяўчат. У гэтым годзе для іх было адведзена 13 месцаў (дзесяць — на крымінальна-выканаўчы факультэт і тры — на следча-экспертны).

Спадзяёмся, што курсанты на ўсё жыццё запомняць словы прысягі і застануцца ім вернымі.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**



Будзьце пільныя!

# ПАПЯРЭДЗІЦЬ БЯДУ

## На што варта звярнуць увагу бацькам непаўналетніх?

**На падыходзе — новы навучальны год. І калі бацькі дагэтуль не паклапаціліся аб тым, каб сабраць сваіх дзяцей у школу, то ў іх яшчэ ёсць на гэта час. Аднак, думаючы пра тое, у якім адзенні школьнікі пойдуць на першы званок і што панясуць з сабой у партфелі, нельга забываць аб самым важным — нагадаць дзецям аб іх бяспецы.**

У гэтым бацькам дапамогуць супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Каму, як не ім, ведаць, у якія непрыемнасці, у тым ліку звязаныя з парушэннем заканадаўства, трапляюць дзеці. І далёка не заўсёды, па віне апошніх — зацікаўленых уцягнуць падлеткаў у злачынную дзейнасць нямала. Зарабляючы на гэтым вялікія грошы, злачынцы ламаюць непаўналетнім лёсы.

### ПАКУЛЬ ПЯТУХ НЕ КЛЮНЕ

— Дзеці — лёгкая здабыча для зламыснікаў, — адзначае **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксандр БЛІЗНЮК**. — І ў шэрагу выпадкаў ад таго, хто першым завядзе гутарку з падлеткам: міліцыянер, які прыйшоў у школу для прафілактычнай размовы, або прадстаўнік наркамаркету праз перапіску ў сацсетках, можна меркаваць, які шлях выберэ неахрэплая асоба. Вядома, перасцерагаць дзяцей ад неправавых дзеянняў і расказваць аб наступствах, якія яны нясуць, павінны і бацькі. Аднак, як паказвае практыка, не ўсе з іх суадносяць небяспеку сучаснага свету са сваімі дзецьмі і, адпаведна, пазбягаюць няэручных тэм.

А пра гэта гаварыць трэба. У прыватнасці, пра шкоду наркотыкаў. Аднак калі пра трагічныя наступствы іх спажывання ўжо больш-менш зразумелі, то рэальныя тэрміны зняволення, якія свецяць у выпадку незаконнага абароту наркотыкаў, мала каго з падлеткаў палохаюць. Пакуль, як кажуць, пятух не клюне. У прыватнасці, некалькі месяцаў таму за распаўсюджванне дурману аператыўнікі затрымалі 14-гадовую дзяўчынку. З перапіскі школьніцы з куратарам наркамаркета стала зразумелым: яна добра ўсведамляла наступствы, бо згадвала «работадаўцу» ў дачыненні да ўжо затрыманых аднагодкаў. Дзялілася яна са зламыснікамі і інфармацыяй аб прафілактычнай рабоце, якая праводзіцца інспектарам па справах непаўналетніх — адным словам, ведала, на што ішла.

Супрацоўнікі міліцыі фіксуюць новы від злачынства, у якім задзейнічаны дзеці. Непаўналетнія тэлефануюць пажылым грамадзянам і паведамляюць аб тым, што хтосьці з іх сваякоў — унучка, дачка або нехта іншы — здзейсніў цяжкае дарожна-транспартнае здарэнне. Грамадзянам даводзяць, што пацярпелы знаходзіцца ў цяжкім стане, аднак, каб пазбегнуць адказнасці, можна вырашыць пытанне — і пад такой маркай выманьваюць буйныя сумы грошай. У адносінах да некалькіх падлеткаў, якія займаліся такім відам махлярства, ужо заведзены крымінальныя справы.

Як расказвае Аляксандр Блізнюк, галоўнае, што падштурхоўвае дзяцей да парушэння закона, — жаданне мець уласныя грошы. Акрамя таго, адной з прычын, па якой непаўналетнія ідуць на злачынства, з'яўляецца іх незанятасць: асабліва гэта актуальна ў летні перыяд. А, між іншым, па заканадаўстве хлопцы і дзяўчаты могуць стаць супрацоўнікамі арганізацыі з 14 гадоў. Галоўнае — жаданне, а вакансія абавязкова знойдзецца. Спосабаў карысна правесці вольны час нямала: можна наведваць гурткі, спартыўныя секцыі, адпачываць у аздараўленчых летніках. Толькі на базе воінскіх часцей унутраных войскаў дзейнічае 17 ваенна-патрыятычных клубаў, дзе ўхіл зроблены на ваенную і спартыўную падрыхтоўку. Там дакладна сумна не будзе.

### МНОГАЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД БАЦЬКОЎ

У найбліжэйшы час інспектары возьмуць удзел у бацькоўскіх сходах і педагагічных саветах, каб расказаць аб схемах уцягнення дзяцей у супрацьпраўныя паводзіны, якімі карыстаюцца зламыснікі. Раскажуць яны і аб спосабах, алгарытмах супрацьдзеяння сучасным выклікам і пагрозам. Наведаюць праваахоўнікі дзіцячыя дамы і вёскі, інтэрнаты, прыёмныя і апякунскія сем'і, а таксама сем'і, дзе непаўналетнія выхоўваюцца пры ўдзеле айчымаў. Гэтыя візіты ў першую чаргу будуць накіраваныя на папярэджанне злачынстваў супраць палавой свабоды і недатыкальнасці ў адносінах да малалетніх.

— На жаль, такіх злачынстваў выяўляецца ўсё больш, — заўважае Аляксандр Блізнюк. — Напярэдадні новага навучальнага года мы падрыхтавалі комплекс прафілактычных мерапрыемстваў, якія ўжо пачалі праводзіцца ва ўстановах адукацыі. У першую чаргу педагогам даводзіцца, на што звяртаць увагу ў паводзінах дзяцей. Увагу бацькоў засяроджваем на тое, з кім іх дзеці маюць стасункі, што яны робяць у інтэрнэце — часцей за ўсё, знаёмства злачынцаў са сваімі будучымі ахвярамі адбываецца менавіта ў віртуальнай прасторы. Ад бацькоў залежыць многае. Калі яны ўважлівыя да сваіх дзяцей, калі паміж імі ўстаноўлены даверлівыя адносіны, трагедыі можна пазбегнуць.

Яшчэ адна з негатыўных тэндэнцый апошняга часу — павялічваецца колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з дзецьмі. Пры гэтым варта заўважыць, што, пераважна дзіця ў аўтамабілі без утрымлівальнага крэсла, бацькі рызыкуюць здароўем і нават жыццём сваіх нашчадкаў. Трагічныя выпадкі з дзецьмі, якія рэгулярна фіксуюцца супрацоўнікамі міліцыі, — сведчанне безадказнасці дарослых.

Апошнім часам усё часцей надзвычайныя здарэнні з дзецьмі адбываюцца і на аб'ектах чыгуначнага транспарту. Нярэдка сэлфі, зробленыя на фоне цягніка, які набліжаецца, становяцца апошнімі. Няўважліва сябе паводзяць непаўналетнія і падчас пераходу чыгуначных пуцей. У гэтым плане важна разумець, што цягнік у адно імгненне не спыніцца! Машыніст, безумоўна, убачыўшы парушальніка, але своечасова затармазіць не паспее.

Праваахоўнікаў хвалююць і непаўналетнія кіроўцы, якіх таксама нямала. З пачатку года зафіксавана 12 выпадкаў кіравання аўтатранспартам дзецьмі. Адзін з апошніх, які адбыўся ў Бярозаўскім раёне, увогуле аказаўся рэзанансным. Пяцігадовы хлопчык сеў у аўтамабіль і павярнуў ключ запальвання, у выніку чаго пацярпела сямігадовае дзіця, якое спрабавала ў гэты час дастаць з-пад машыны кацяня. Хлопчык быў шпіталізаваны з цяжкімі траўмамі. Дзе ў гэты час былі бацькі як аднаго, так і другога хлопчыка — пытанне рытарычнае.

**Вераніка КАНЮТА.**

Альма-матар

# Жыццё — на служэнне Радзіме

## Аб гэтым мараць выхаванцы Спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў

**Завяршыўся восьмы набор курсантаў у Спецыялізаваны ліцэй МУС. Новае папаўненне сямікласнікаў днямі запоўніць сваімі звонкімі галасамі сцены навучальнай установы, якая ў сувязі з летнім перыядам часова апусцела. Перш чым прыступіць да заняткаў, на працягу некалькіх дзён у іх будзе магчымасць пазнаёміцца з ліцэем, які на найбліжэйшыя пяць гадоў стане для іх як альма-матар, так і другім домам.**





Па традыцыі ўчарашніх школьнікаў сустрэне іх «другі бацька», а па сумяшчальніцтве **начальнік Спецыялізаванага ліцэя МУС генерал-маёр міліцыі Віктар ЖЫБУРТОВІЧ**, які першым скажа гэтым яшчэ юным асобам самыя важныя словы. Кіраўнік установы заўсёды ўважліва ставіцца да навічкоў, робіць усё дзеля таго, каб адаптацыя прайшла для іх як мага хутчэй. Звярнуцца да генерала ліцэісты могуць па любым пытанні і вельмі ганарацца, калі ён віншуе іх з днём нараджэння — адпаведны запіс-пажаданне з'яўляецца ў дзённіку кожнага хлопца. Як жартуе начальнік установы, цяпер хоць дзённікі перасталі губляць!

З першых хвілін знаёмства стала вядома, што Віктар Жыбуртовіч — чалавек тут невыпадковы. Ён вельмі любіць дзяцей — і гэтым усё сказана. Напярэдадні новага навучальнага года мы пагаварылі аб тым, ці з ахвотай школьнікі паступаюць у ліцэй, чаму не расчароўваюцца ў сваім выбары і ці многія пасля заканчэння ўстановы вырашаюць абраць афіцэрскі шлях.

***— Віктар Валянцінавіч, новае папаўненне ліцэістаў неўзабаве прыступіць да навучальнага працэсу з ухілам на спецыфіку праваахоўнай дзейнасці. Якія вынікі ўступнай кампаніі гэтага года?***

— Традыцыйна ліцэй МУС карыстаецца папулярнасцю ў юных жыхароў краіны, паколькі з'яўляецца адзінай установай агульнай сярэдняй адукацыі з такой спецыфікай. Мы не толькі даём агульную базавую і агульную сярэднюю адукацыю. Мы рыхтуем хлопцаў да паступлення ў сілавыя вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. За сем гадоў існавання ліцэй набыў славу, уяўленне аб нас маюць людзі з усёй краіны. Сёлета сюды выказалі жаданне паступаць 142 дзіцяці з усёй Беларусі. Ахвотных было яшчэ больш — не ўсе прайшлі медыцынскі агляд. Набор склаў 50 чалавек.

***— Адбор у вас вельмі строгі...***

— Мала ведаць матэматыку, рускую, беларускую мовы. Трэба мець добрую спартыўную падрыхтоўку і медыцынскую прыдатнасць, каб навучацца ў ліцэі.



Абітурыенты прадэманстравалі высокія веды і здольнасці па прадметах. Адразу было відаць, што яны зацікаўлены ў сваім паступленні. Сёлета, каб крыху спрасціць сістэму, мы адмовіліся ад фізкультуры пры паступленні: справа ў тым, што хлопцы і так праходзяць вельмі сур'ёзны адбор па фізпаказаннях. Вядома, паступілі не ўсе. Прычым працэнт дзяцей, якія прыехалі да нас з сельскай мясцовасці і малых гарадоў Беларусі, складае каля 38.

***— Ліцэй з'яўляецца домам і для дзяцей з найбольш уразлівых сацыяльных груп...***

— Гэтай катэгорыі ліцэістаў — заўсёды асаблівая ўвага. Нягледзячы на прывілеі, хлопцы паспяхова здаюць іспыты і паказваюць сваю высокую канкурэнтаздольнасць. Усяго ў нас вучыцца 15 хлопцаў з гэтай катэгорыі. І варта адзначыць, што гэта не праблемныя дзеці. Хлопцы выдатна дэманструюць свае веды на алімпіядах, удзельнічаюць у шматлікіх конкурсах, вядуць канцэрты. У сценах ліцэя яны мяняюцца: калі спачатку гэта самыя калючыя дзеці, то потым, напэўна, самыя добрыя і спагадлівыя. Памятаючы свой вопыт, яны здольныя перанесці на сваю службу разуменне таго, як правільна паступаць у той ці іншай сітуацыі. Памятаюць яны і ліцэй, дзе іх адзелі, абагрэлі, навучылі, далі шлях — не кожны ж, будучы ў дзіцячым доме, марыць паступіць у Акадэмію МУС! Да нас яны прыходзяць вельмі матываванымі: ставяць перад сабой мэту не толькі вывучыць матэматыку, фізіку або гісторыю, а стаць афіцэрам, міліцыянерам і ўсё сваё жыццё прысвяціць служэнню Радзіме.

***— А ці спраўджваюцца мэты? Колькі выпускнікоў гэтага года абралі афіцэрскі шлях?***

— Сёлета мы выпусцілі 47 хлопцаў. Чаму не 50, колькі штогод мы прымаем, спытаеце? У жыцці ўсялякае бывае. Паступіўшы ў сёмым класе, да выпуску ў маладога чалавека можа памяняцца фізічнае здароўе. Напрыклад, дыягнаставаны парок сэрца, якога раней не было. Для такога дзіцяці навучэнне ў ліцэі не з'яўляецца функцыянальным — ён не зможа прайсці ваенна-медыцынскую камісію, каб паступіць у сілавую ВНУ. У такім выпадку бацькі прымаюць рашэнне перайсці зноў у школу, каб потым звязаць сваё жыццё з грамадзянскай спецыяльнасцю. Акрамя таго, у нас крыху іншая навучальная праграма, чым у іншых установах сярэдняй адукацыі. Па ўсёй краіне фізкультура праводзіцца два разы на тыдзень, плюс яшчэ адзін урок па шматлікіх відах спорту. У нашых хлопцаў — чатыры гадзіны фізічнай падрыхтоўкі. І калі ў дзіцяці праблемы са здароўем, ён не атрымае допуску да гэтых заняткаў. Хтосьці сыходзіць па той прычыне, што не вытрымлівае нагрузкі. А набор у 11 класы мы не праводзім нават пры наяўнасці вакантных месцаў. У навучальнай установы — свая спецыфіка, і рэалізаваць яе за адзін год немагчыма.

***— Вы зацікаўлены ў тым, каб большасць вашых выхаванцаў паступіла ў Акадэмію МУС...***

— Працэнт паступлення нашых хлопцаў у сілавыя ВНУ краіны з'яўляецца фактычным паказчыкам нашай работы. У гэтым годзе з 47 чалавек 28 юнакоў сталі курсантамі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, адзін — Магілёўскага інстытута МУС. Пяцёра нашых выпускнікоў працягнуць сваю адукацыю ў Ваеннай акадэміі (чацвёра з іх на факультэце ўнутраных войскаў). Двое паступілі ў БДУІР, на ваенны факультэт, які таксама працуе для сістэмы МУС. Такім чынам, 36 чалавек з 47 абралі для сябе афіцэрскі шлях. Аднак гэта не азначае, што астатнія перадумалі. Калі ў кагосьці не атрымліваецца, гэта заўсёды па аб'ектыўных прычынах.

***— У чым жа сакрэт таго, што за пяць гадоў навучання юнакі свядома ідуць да сваёй мэты?***

— Часта дзеці, якія да нас паступаюць, з'яўляюцца нашчадкамі цэлага пакалення міліцыянераў. Такіх прыкладна каля 30 працэнтаў. Любы хлопчык марыць быць вайскоўцам. Што датычыцца вузкай спецыфікі, рызыкну выказаць здагадку, што ўзровень прэстыжу беларускай міліцыі сапраўды высокі: як на дзяржаўным узроўні, так і ў штодзённым, спажывецкім. Магу вам дакладна сказаць, што ўсе хлопцы, якія прыходзяць да нас вучыцца, гавораць аб сваёй краіне з гонарам, аб міліцыі — з павагай. Для іх амонаўцы, прадстаўнікі ўнутраных войскаў — сучасныя супергероі, якія засланяюць усіх галівудскіх зорак. Тым больш у нас практыкаарыентаванае навучанне, а гэта заўсёды цікава. Наладжана супрацоўніцтва з дзеючымі органамі кіравання МУС і ўнутраных войскаў. Напрыклад, калі ў нас ідзе ўрок гісторыі або грамадазнаўства, мы яго праводзім не ў кабінеце. Выязджаем на «Лінію Сталіна», каб ліцэіст меў поўнае ўяўленне аб тых ці іншых падзеях. Мы наведваем і вайсковыя часці, дзе знаёмім з жыццём ваеннаслужачых, тэхнікай, удзельнічаем у спартыўных спаборніцтвах. Выхоўваем хлопцаў, якія хочуць і могуць абараніць сваю краіну. Патрыятызм — гэта тое, чаго не памацаеш рукамі. Сваіх ліцэістаў мы вучым разумець, у якой краіне яны жывуць і што могуць ёй даць, каб яна стала яшчэ больш моцнай, прыгожай і лепшай.

***— Вы чакаеце свайго самага вядомага курсанта, які быў залічаны ў ліцэй у мінулым годзе, але дагэтуль праходзіў хатняе навучанне, — Рамана Кагадоўскага, які вынес з агня свайго малодшага брата...***

— Калі такія трагічныя падзеі адбыліся і прозвішча Рамана было на слыху ў народа, усёй краіны, мы ўсе сачылі за здароўем гэтага хлопчыка. Для нас было вялікім здзіўленнем і нават гонарам, калі раптам аказалася, што ён марыць служыць. Рашэнне аб навучанні ў ліцэі МУС было няпростым. Яго прымаў непасрэдна міністр унутраных спраў — чалавек з добрым сэрцам і з глыбокім разуменнем таго, што менавіта наш ліцэй — тая прыступка, з якой можна стартаваць далей. Нягледзячы на тое, што ў Ромы сур'ёзныя праблемы са здароўем, ён не памяняў свайго рашэння: як толькі паправіцца да такой ступені, што зможа наведваць заняткі, ён з'явіцца ў ліцэі. Мы яго вельмі чакаем.

***— У вас створаны ўсе ўмовы для навучання і пражывання дзяцей. Такому тэхналагічнаму забеспячэнню, магчымасцям для развіцця можа пазайздросціць любая агульнаадукацыйная ўстанова...***

— У нас цудоўнае тэхнічнае забеспячэнне. Вучэбныя аўдыторыі абсталяваны інтэрактыўнымі дошкамі, камп'ютарнай тэхнікай, маецца доступ у інтэрнэт. Абсталявана спартзала, барцоўская і трэнажорная залы, басейн. І там праходзяць не толькі ўрокі, але і пасляўрочныя заняткі. Акрамя таго, у нас ёсць свая хакейная каманда. Здаровы лад жыцця, фізічная падрыхтоўка будучага абаронцы Айчыны — ад гэтага залежыць многае.

***— На асаблівым кантролі — дысцыпліна. Склалася ўражанне, што ў ліцэі больш строга, чым у арміі...***

— Дысцыпліна — гэта залог поспеху. Калі не будзе парадку, маладыя людзі не змогуць эфектыўна набываць веды і фарміравацца як асобы. Нагрузка ў нас арганізавана такім чынам, каб не траціць час дарэмна. Калі хлопец не займаецца інтэлектуальнай працай, значыць, ён заняты фізічна. У вольны час юнакі не ляжаць на канапе з тэлефонам у руцэ, а, напрыклад, едуць у Валожынскі раён, дзе высаджваюць дрэвы або накіроўваюцца ў падарожжа ў Брэст. Ліцэісты дарма часу не марнуюць. Калі іх не задавальняе гэты тэмп, і здаецца, што нагрузка вялікая, хлопцы выпадаюць з абоймы. Дысцыпліна дазваляе не пераутамляцца з аднаго боку, а з другога — усё паспяваць.



**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з архіва Спецыялізаванага ліцэя МУС.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

## по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении электронных торгов **2022.Ч.002.00091** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец**: Витебское областное потребительское общество, юр. адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Белорусская, 3-45, тел. +375 (02131) 6-65-49.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов**: **29.09.2022 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 202/С-97730, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, г. п. Лиозно, ул. Добромыслянская, 38/2, общей площадью 939,2 кв. м, наименование – скотобойный пункт, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: 2 – хозяйственный блок, 3 – база предубойного содержания, 4 – котельная, 5 – уборная, 1– вход в подвал, (А1-2)/к – подвал.

Капитальное строение с инвентарным номером 202/С-97731, расположенное по адресу: Витебская область, Лиозненский район, г. п. Лиозно, ул. Добромыслянская, 38/1, общей площадью 44,6 кв. м, наименование – трансформаторная подстанция, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности отсутствуют.

— Людзей, якія маюць сур'ёзныя абмежаванні па зроку, насамрэч нямала, — заўважае Ганна падчас экскурсіі. — Хоць іх нячаста можна сустрэць у горадзе. Таму такія экскурсіі — гэта добры вопыт сацыялізацыі, станоўчыя эмоцыі. Людзі адчуваюць, што імі зацікаўлены, што яны — паўнавартасныя грамадзяне, уцягнутыя ў гарадскую, культурную прастору, могуць атрымаць тое, чаго былі пазбаўлены. Сітуацыя мяняецца.

Група пацыху пераходзіць ад аднаго будынка да другога. Для звычайных турыстаў на маршрут у 500 метраў хопіць паўгадзіны. Але ў інвалідаў па зроку тэмпы іншыя — нават невялікую адлегласць яны пераадольваюць значна даўжэй. Вось так, няспешна група рухаецца па вуліцы Замкавай, якая вядзе да сэрца горада — каралеўскіх замкаў. Праз гэту вуліцу ў каралеўскую рэзідэнцыю з'язджаліся ўдзельнікі сеймаў — магнаты і шляхта, працягвае Ганна свой аповед. Калісьці на вуліцы месцілася ажно шэсць палацаў, два з іх дайшлі да нашых часоў. Напрыклад, у асабняку Масальскіх — самым старым доме Гродна — ішлі здымкі кінафільма пра багацце Радзівілаў «Сляды апостала».

Каб дапамагчы інвалідам па зроку атрымаць уяўленне аб форме маштабных аб'ектаў, арганізатары экскурсіі падрыхтавалі спецыяльны альбом з выявай усіх асноўных славутасцяў маршрута.

— Было б нядрэнна, каб каля кожнага знакавага аб'екта стаялі такія міні-макеты, напрыклад, з пенапласту ці дрэва. Каб інваліды па зроку маглі іх мацаць і атрымліваць прадстаўленне аб аб'екце. А мы дапоўнім яго расповедам аб памерах будынка і іншай цікавай інфармацыяй. Дарэчы, такія макеты будуць цікавыя і ўсім турыстам, — лічыць Ганна.

На яе думку, гарадское інклюзіўнае асяроддзе не да канца прадуманае. Пакуль зроблены ў прамым сэнсе першыя крокі ў выглядзе пераходаў з тактыльнай пліткай. Але трэба ісці далей. Напрыклад, устанавіць інфармацыйныя стэнды са шрыфтам Брайля. Прычым яны павінны быць напісаны простай мовай. Таксама складана знайсці метадычныя рэкамендацыі па правядзенні спецыяльных экскурсій для людзей з аслабленым зрокам. Пакуль матэрыял прыходзіцца напрацоўваць праз уласны вопыт. Вялікі мінус — унутраныя памяшканні, якія наогул не разлічаны на такога кшталту экскурсіі.

Між тым запатрабаванасць у іх ёсць. Арганізатары ўжо атрымалі некалькі замоў на верасень. З просьбай правесці экскурсію для вучняў спецыялізаванай школы звярнуліся педагогі. Таксама выказалі жаданне прадстаўнікі медыцынскага каледжа, дзе таксама нямала навучэнцаў з праблемамі зроку.

— Гэты праект будзе пашырацца, — упэўнена суразмоўца. — Ім зацікавіліся ў абласным упраўленні спорту і турызму, запрасілі расказаць на канферэнцыі, якая была прысвечана інклюзіўнаму турызму і праходзіла ў мінулым годзе анлайн. Мне давялося выступіць з дакладам.

Яна настойвае на тым, што ў сферы турызму павінны быць гатовы працаваць і з такой катэгорыяй людзей. Напрыклад, у тых жа кавярнях. Дарэчы, у маршруце экскурсіі прадугледжана наведванне такой установы. Праз пахі ўдзельнікі ўспрымаюць гэта месца ў гарадскім асяроддзі. Але такі падыход несістэмны. Напрыклад, можна было б у некалькіх кавярнях прапанаваць меню, у тым ліку, і са шрыфтам Брайля.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна.**



Стыхія

# СПЯКОТНАЕ ЛЕТА ПАЛЕССЯ

ЛЕТА вырашыла сысці сёлета шырока і гучна, бразнуўшы дзвярыма. У палескіх раёнах Брэстчыны ўжо тыдзень у сярэдзіне дня слупок тэрмометра даходзіць да 35 градусаў. Асаблівa цяжка дарожным рабочым — на вуліцах Давыд-Гарадка яны часта працуюць, распрануўшыся да пояса. А бабулі, якія гандлююць каля ўваходу ў рынак горада Іванава, пахаваліся ад сонца пад навес аўтобуснага прыпынку. На самім іванаўскім рынку ў разы перавыконвае план прадаўшчыца квасу, а побач мама спрабуе схаваць галаву свайго сына пад папяровым пакетам. На палях Столінскага раёна пачалася ўжо ўборка асення-спеючай кукурузы. А супрацоўнікі МНС Бярозаўскага раёна аблілі дзятву прахалоднай пажарнай пенай. Ды і грыбнікі Берасцейшчыны ўжо пацыху пачынаюць выносіць з лесу першыя белыя грыбы і падбярозавікі. Але весялей за ўсё на берагах Прыпяці, дзе адпачывальнікі і турысты практычна не вылазяць з ракі, ставяць намётавыя гарадкі, весяляцца пад музыку, якая вылятае з дынамікаў прыпаркаваных аўто, купаюцца або катаюцца на надзіманых лодках. Па прагнозах сіноптыкаў рэкордна-гарачыя дні пратрымаюцца амаль да канца жніўня.

**Віктар ДРАЧОЎ.**
**Фота аўтара.**









# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЫИГРЫВАЙ С ONLINER 27»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51(с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 27» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети Интернет сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись (профиль)** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**«Onliner Pay»** – сервис онлайн-оплаты товаров на интернет-сайте Организатора, позволяющий осуществлять оплату товаров безналичным способом с использованием валидированной (привязанной) к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточки. Сервис реализует механику безопасной оплаты. Партнерами сервиса выступают «МТБанк» и платежный сервис bePaid. Процессинговая система bePaid соответствует всем требованиям стандарта безопасности PCI DSS Level 1, который регламентирует прием, обработку и хранение карточных данных.

**«Банковская платежная карточка»** – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**1. Организатор и Заинтересованное лицо Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

1.2. Заинтересованное лицо Рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «МИ БАЙ», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291478180, Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 26.06.2017.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Выигрывай с Onliner 27».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

4.1. Рекламная игра проводится с 05.09.2022 по 14.11.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования продаж товаров, реализуемых интернет-магазинами, размещенными в разделе сайта https://catalog.onliner.by, посредством онлайн-оплаты товаров с использованием сервиса «Onliner Pay».

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

– Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

– Елизаров Денис Евгеньевич, ООО «МИ БАЙ», директор;

– Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;

– Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;

– Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by, приобретающее товар исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

7.4. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии выполнения требований, закрепленных в п. 8.1 – 8.2 настоящих Правил.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. зарегистрироваться на интернет-ресурсе https://www.onliner.by учетную запись (профиль) на заявленных администрацией сайта условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи (профиля), при этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью;

8.1.3. валидировать (привязать) к учетной записи (профилю) банковскую платежную карточку, которую пользователь планирует использовать для онлайн-оплаты товаров через сервис «Onliner Pay»;

8.1.4. в период с 05.09.2022 по 09.10.2022 до 23.59.59 (включительно) оформить заказ на приобретение одного либо нескольких товаров на сумму не менее чем **20** (двадцать) белорусских рублей **00** (ноль) копеек на интернет-ресурсе https://www.onliner.by посредством функции «Корзина» в интернет-магазинах, размещенных в разделе https://www.catalog.onliner.by, оплатить заказанный товар в онлайн-режиме через сервис «Onliner Pay», воспользовавшись для этих целей валидированной (привязанной) к учетной записи (профилю) пользователя банковской платежной карточкой.

8.2. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые успешно выполнили приведенные выше в п. 8.1 требования, при условии, что их заказ в последующем получит статус «Доставлен» в обозначенный в п. 10 настоящих Правил срок и при этом итоговая сумма приобретенного (выкупленного) пользователем товара (товаров) составит не менее чем **20** (двадцать) белорусских рублей **00** (ноль) копеек.

Статус «Доставлен» присваивается заказу пользователя в случае, когда последний фактически принял от продавца хотя бы один товар из оформленного им заказа. В случае отказа пользователя от получения заказанного товара (товаров), предоплаченные за заказ денежные средства возвращаются на банковскую платежную карточку ее держателя в установленный законодательством срок.

8.3. Каждый надлежаще совершенный и оплаченный пользователем заказ получит свой уникальный номер согласно дате и времени оформления заказа. Информация о присвоенном заказу уникальном номере будет отправлена пользователю на указанный им в процессе оформления заказа электронный почтовый ящик. Соответствующее сообщение поступит пользователю в течение 1 (одного) часа с момента оформления заказа. В случае успешного завершения процедуры приобретения товара заказ пользователя получит статус «Доставлен». Уведомление об изменении статуса заказа будет отправлено пользователю на его электронную почту, а также данная информация будет дополнительно транслироваться в персональной учетной записи (профиле) пользователя. Такое сообщение поступит пользователю в течение 1 (одного) часа с момента вручения ему заказа продавцом.

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора, а также имущества Заинтересованного лица в размере **8380** (восемь тысяч триста восемьдесят) белорусских рублей **10** (десять) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС, % | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз | Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum-Mop 2 (STYTJ03ZHM) | 10 | 750,00 | 7500,00 | без НДС | – | 7500,00 |
| | денежные средства в размере | | 88,01 | 880,10 | – | – | 880,10 |
| **Итого:** | | | | | | | **8380,10** |

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призов осуществляется в 5 (пять) туров в приведенном в таблице порядке:

| Номер тура | Дата и время проведения розыгрыша | Участвуют заказы Участников, получившие статус «Доставлен» в следующий период времени проведения Рекламной игры | Участник подтвердил свое желание принять участие в игре | Приз розыгрыша |
|---|---|---|---|---|
| Тур 1 | 16.09.2022, в 12.00 | с 05.09.2022 по 11.09.2022 (23.59.59) включительно | не позднее 11.09.2022 (23.59.59) | «Приз» всего 2 (два) приза |
| Тур 2 | 23.09.2022, в 12.00 | с 12.09.2022 по 18.09.2022 (23.59.59) включительно | не позднее 18.09.2022 (23.59.59) | «Приз» всего 2 (два) приза |
| Тур 3 | 30.09.2022, в 12.00 | с 19.09.2022 по 25.09.2022 (23.59.59) включительно | не позднее 25.09.2022 (23.59.59) | «Приз» всего 2 (два) приза |
| Тур 4 | 07.10.2022, в 12.00 | с 26.09.2022 по 02.10.2022 (23.59.59) включительно | не позднее 02.10.2022 (23.59.59) | «Приз» всего 2 (два) приза |
| Тур 5 | 14.10.2022, в 12.00 | с 03.10.2022 по 09.10.2022 (23.59.59) включительно | не позднее 09.10.2022 (23.59.59) | «Приз» всего 2 (два) приза |

Розыгрыш призового фонда будет проводиться в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда и определения Победителей Рекламной игры**

11.1. До момента проведения розыгрыша призов в каждом из туров Рекламной игры Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется по дате и времени оформления Участниками заказов. Каждый такой заказ получит свой порядковый итоговый номер, который является участвующим в соответствующем розыгрыше Игровым кодом. Нумерация Игровых кодов в Списке начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код Участника; номер заказа; дату и время оформления заказа; дату и время присвоения заказу статуса «Доставлен»; дату и время, когда Участник подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрышей используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Каждый розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3 – 11.5 настоящих Правил, и следующий 300-й (трехсотый) за ним в Списке, в количестве 1 (одного) Игрового кода. В каждом туре разыгрывается 2 (два) приза.

В случае если выигрышный Игровой код Участника попадает на конец Списка, дальнейшее исчисление Игровых кодов продолжается с начала Списка.

11.7. Результаты каждого розыгрыша фиксируются в соответствующем протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Сроки и порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет Победителя о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Победителем при создании и оформлении заказа. Организатор также вправе дополнительно уведомить Победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер мобильного телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза Победители должны явиться не позднее 14.11.2022 (включительно) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 12.11.2022 с 10.00 до 13.00. При получении приза Победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с Победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1. способами; неявки Победителя за получением приза в определенный в п. 13.1. срок; указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; непредоставления Организатору сведений и документов, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, – Победитель лишается права на получение приза. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении Победителю выигрыша обязан удержать у последнего причитающиеся денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя приза.

13.5. Расходы, связанные с проездом Победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 03.11.2022 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – Onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в публикациях, связанных с опубликованием результатов Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (плохое соединение с оператором, отсутствие интернет-эквайринга и т. д.) и почтовых сервисов (несвоевременная доставка электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, а также посредством электронной почты – game27@onliner.by.

*Свидетельство № 4222 о государственной регистрации Рекламной игры выдано 16 августа 2022 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




У сярэдзіне дзевяностых мы з цікаўнасцю назіралі за работай урада. Ён ужо быў прызначаны Прэзідэнтам, скіраваны на рэалізацыю яго праграмы развіцця краіны, нарэшце перш за ўсё на рашэнне надзённых эканамічных праблем: у краіне спынялася прамысловая вытворчасць, трэба было зразумець, як у новых умовах арганізаваць сельскую гаспадарку, гандаль, сферу паслуг.

Не было грошай нават на рэгулярную выплату заробкаў, ды і купляць у крамах не было чаго — паліцы практычна пуставалі. Прэзідэнт, не хаваючы гэтых цяжкасцяў, гаварыў шчыра: краіну трэба адводзіць ад прорвы. Таму з непрыхаванай цікаўнасцю праз газеты, тэлебачанне мы назіралі за выступленнямі, рашэннямі, дзеяннямі членаў урада, пачалі пазнаваць іх на экранах, унікалі ў тое, што яны гавораць. Нам жа надзвычай патрэбны былі арыенціры і для сваёй працы. У першую чаргу мы, безумоўна, сачылі за міністрам адукацыі — тады гэта быў Васіль Іванавіч Стражаў.

Але з не меншай цікаўнасцю назіралі і за працай міністра эканомікі, разумеючы, што адраджэнне нармальнага жыцця ў краіне трэба пачынаць з вырашэння гаспадарчых праблем. У 1994—1996 гады міністрамі эканомікі былі Сяргей Сцяпанавіч Лінг (ён пасля, з 1997 да 2000 года, узначальваў урад) і Георгій Пятровіч Бадзей. Да іх як да міністраў эканомікі мы прызвычаіцца не паспелі. А вось да Уладзіміра Мікалаевіча Шымава на гэтай пасадзе за час з 1996 да 2002 года прыглядзеліся ўважліва.

Знешне строгага выгляду, заўсёды з густам апрануты і, галоўнае, надзвычай зразумела і даходліва ўмее выкладаць свае думкі, ён выклікаў павагу перш за ўсё тым, што сістэмна, у маштабе краіны рэалізоўваў стратэгічныя ўстаноўкі Прэзідэнта — максімальна захаваць закладзены ў Савецкім Саюзе эканамічны патэнцыял краіны і на яго базе развіваць новыя сучасныя вытворчасці і тэхналогіі.

У лістападзе 2009 года, у час афіцыйнага візіту ва Украіну, я слухаў лекцыю Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, з якой ён выступаў ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі. У ёй Прэзідэнт грунтоўна выкладаў асновы сучаснай беларускай эканамічнай палітыкі. У прыватнасці, гаварыў, што ў савецкі час урад СССР ва Украіне, Беларусі, рэспубліках Прыбалтыкі размяшчаў высокатэхналагічныя вытворчасці. Напрыклад, навошта нам цяпер ажно тры найвелізарнейшыя аўтамабільныя заводы, гіганцкі трактарны завод, два тэлевізійныя заводы, буйныя прадпрыемствы радыёэлектроннай прамысловасці, маштабная сетка хімічных вытворчасцяў? Калі б мы першапачаткова развіваліся як незалежная краіна, можа быць, такія грандыёзныя фабрыкі і заводы не будавалі б, а сканцэнтраваліся, напрыклад, на глыбокай перапрацоўцы драўніны ці пастаўках па ўсім свеце пітной вады. У савецкія часіны прадукцыя нашых буйных прадпрыемстваў імгненна разыходзілася на бязмежным рынку вялікай краіны. А цяпер усе былыя рэспублікі СССР, набыўшы незалежнасць, захапіліся рынкавай эканомікай, да іх шухнулі тавары з Захаду і з Усходу, ранейшыя аб'ёмы прадукцыі мы і цяпер можам зрабіць, але як яе прадаць?

У той самы час ад размяшчэння ў Беларусі буйнай прамысловай вытворчасці мы атрымалі каласальную карысць. Такія рашэнні вышэйшага кіраўніцтва Савецкага Саюза перш за ўсё дэманстравалі паважлівае стаўленне да беларусаў, іх інтэлектуальнага патэнцыялу, арганізаванасці, стараннаў і адказнасці за даручаную справу. У адпаведнасці з такім маштабным і інтэнсіўным развіццём прамысловасці ў Беларусі патрабаваліся высокакваліфікаваныя навуковыя, інжынерныя, рабочыя кадры, а гэта садзейнічала развіццю і ўмацаванню сістэмы адукацыі ад сярэдніх школ, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў да ўніверсітэтаў і навукова-адукацыйных цэнтраў. Як жа нам адмовіцца ад такога багацця?! Таму мы сталі на прамысловай базе, якая склалася ў Савецкім Саюзе, будаваць эканоміку сучаснай суверэннай Беларусі. І бачым, што не памыліліся! І прадукцыю навучыліся рабіць якасную, запатрабаваную, і рынкі для яе рэалізацыі знайшлі.

Вось на рашэнне гэтых задач Прэзідэнт у 1996 годзе і камандзіраваў вучонага-эканаміста Шымава, разумеючы, што ён як ніхто іншы падыходзіць зараз на пасаду міністра эканомікі.

Уладзімір Мікалаевіч скончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава па спецыяльнасці «Эканамічная геаграфія», затым аспірантуру Савета па вывучэнні вытворчых сіл пры Дзяржплане СССР. Працаваў загадчыкам сектара эканоміка-матэматычных метадаў, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце навукова-даследчага эканамічнага інстытута Дзяржплана БССР, дацэнтам, загадчыкам кафедры, прарэктарам па вучэбнай рабоце Гомельскага кааператыўнага інстытута, першым намеснікам міністра эканомікі.

Тэматыку яго навуковых зацікаўленняў выразна відаць з назваў дысертацый, абароненых ім, — у Савеце пры Дзяржплане СССР (кандыдацкая): «Пытанні методыкі рэгіянальнай эканамічнай ацэнкі прыродных рэсурсаў», і на эканамічным факультэце МДУ імя М. В. Ламаносава (доктарская): «Вымярэнне і планіраванне рэгіянальнай эфектыўнасці грамадскай вытворчасці (пытанні метадалогіі)». Прэзідэнт не памыліўся, міністр эканомікі Шымаў дапамог яму адвесці краіну ад прорвы, болей за тое — стварыць эфектыўную эканоміку сучаснай Беларусі.

Пасада міністра вымагае гранічнага напружання, а выключна адказны за даручаную справу Уладзімір Мікалаевіч на працы сябе ніколі не шкадаваў. Пасля шасці гадоў работы ва ўрадзе захварэў, папрасіўся ў Прэзідэнта ў адстаўку. Аляксандр Рыгоравіч разумеў, што трэба яе прыняць, але і не выкарыстоўваць такі вопыт было б няправільным. Прапанаваў міністру пасаду рэктара эканамічнага ўніверсітэта. Шымаў пагадзіўся, і тым самым гэтая ВНУ ў якасці свайго кіраўніка набыла вучонага-эканаміста, вопытнага практыка ў рэалізацыі эканамічных дактрын, мудрага настаўніка.

Да 2002 года Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт узначальваў прафесар Раман Міхайлавіч Карсека. Мы ведалі адзін аднаго, таму што сустракаліся ў міністэрстве на розных нарадах. Раней гэтая ВНУ называлася Беларускім дзяржаўным інстытутам народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава і заўсёды лічылася адной з самых прэстыжных ВНУ Беларусі. Яе ў народзе паўсюль паважліва называлі «наргас». Таму і рэктар гэтага інстытута намі безагаворачна ўспрымаўся як вельмі аўтарытэтны не толькі ў сістэме вышэйшай адукацыі, але і ўвогуле па краіне чалавек. Раман Міхайлавіч такім і быў: знешне спакойны, нешматслоўны, інтэлігентны. Бліжэй мне з ім пазнаёміцца не давялося: у 2002 годзе па ўзросце ён сышоў у адстаўку, і на яго месца быў прызначаны прафесар Шымаў.

Тым разам я прыехаў на чарговую калегію міністэрства. Яна была пашыранай, праходзіла ў адной з залаў пасяджэнняў Савета Міністраў, людзей было запрошана шмат, і, калі я туды зайшоў, практычна ўсе месцы былі занятыя. Вольнае крэсла я пабачыў толькі ў канцы памяшкання побач з... Шымавым. Пазнаў яго па экранным вобразе. Ён мне сказаў, што месца побач з ім вольнае і што ён прысутнічае на калегіі першы раз на пасадзе рэктара эканамічнага ўніверсітэта.

Я ў сваю чаргу прадставіўся, але мне падалося, што завочна ён таксама мяне ведае. Падчас пасяджэння калегіі мы амаль не размаўлялі, ціха абмяняліся некалькімі рэплікамі па пытаннях, якія абмяркоўваюцца, але дакладна зразумелі, што думаем і разважаем падобным чынам. Спачатку я вёў сябе стрымана, Шымаў — вядомы на ўсю краіну чалавек, аўтарытэтны эканаміст, былы міністр. Але разам з тым адчуў, што мне побач з ім камфортна. Ён вядзе сябе дэмакратычна, сваё меркаванне не навязвае, уважлівы да таго, што адбываецца навокал. Мне падалося, што і да мяне ён адносіцца з цікавасцю. З таго моманту мы пры сустрэчы віталіся як знаёмыя адзін аднаму людзі, але агульных спраў як у рэктараў у нас не было. Аднак нават гэтыя нячастыя сустрэчы і невялікія размовы дазволілі мне ўжо наяве адчуць незвычайнасць асобы новага рэктара БДЭУ.

Міністрам адукацыі Прэзідэнт прызначыў мяне 6 жніўня 2003 года, і я адразу акунуўся ў безліч неадкладных спраў і праблем. Поўным ходам ішла падрыхтоўка навучальных устаноў да новага навучальнага года, фарміраваўся бюджэт ведамства на наступны год, плюс да ўсяго я быў прызначаны упаўнаважаным Прэзідэнта па Магілёўскай вобласці. Мне ўвогуле трэба было асэнсаваць, зразумець у цэлым функцыянаванне сістэмы адукацыі краіны ва ўсіх яе аспектах. Я адчуў, што ў кіраванні гэтай галіной мне трэба абапірацца на рэктараў, таму першую шырокую нараду запланаваў менавіта з імі і выбраў для яе правядзення базу эканамічнага ўніверсітэта. Выбраў інтуітыўна, хоць агульнавядома, што такія рашэнні грунтуюцца на абвостраным успрыняцці навакольных абставін і падказваюцца выпрацаваным папярэднімі пакаленнямі вопытам.

Тэмы для абмеркавання на гэтай нарадзе былі вызначаны даручэннямі Прэзідэнта, дадзенымі мне пры прызначэнні: запатрабаванасць па ўніверсітэтах (у тым ліку прыватнай формы ўласнасці) і іх аптымальная колькасць для сучаснай Беларусі, неабходнасць двухступеньчатай вышэйшай адукацыі, адзіныя для ВНУ правілы прыёму, заснаваныя на цэнтралізаваным тэсціраванні, і іншыя. Запрошаны былі ўсе рэктары, Уладзіміра Мікалаевіча я папрасіў забяспечыць тэхнічны бок нарады, пачаставаць калег чаем і кавай перад абедам і пасля нарады. Асабістая зацікаўленасць у гэтай нарадзе была і ў Шымава: ён зрабіў рамонт актавай залы ў вучэбным корпусе на Партызанскім праспекце, і яму не цярпелася паказаць яго калегам.

У прэзідыум нарады я запрасіў старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю А. А. Тозіка. Камітэт штогод кантраляваў ход уступных экзаменаў у ВНУ, і Анатоль Афанасьевіч не хаваў сваёй зацікаўленасці ў выкарыстанні цэнтралізаванага тэсціравання пры наборы студэнтаў.

Зразумелай была прысутнасць у прэзідыуме і для віцэ-прэм'ера У. Н. Дражына — ён ва ўрадзе курыраваў усю сацыяльную сферу. Папрацаваць у прэзідыуме даў згоду і старшыня ВАК акадэмік А. М. Рубінаў — ён быў занепакоены прызначэннем магістратуры, яе ўладкаванасцю ў сістэму падрыхтоўкі навуковых кадраў. Я таксама вырашыў, што Шымаў павінен быць у прэзідыуме як гаспадар універсітэта, які нас прымае. Старшыню Савета рэктараў, рэктара БДУ прафесара А. У. Казуліна ў прэзідыум не запрасіў. Не таму, што ён ужо тады вёў сябе часам задзірліва незалежным, — у мяне да гэтага часу адбылося з ім некалькі рабочых сустрэч, і ўвогуле мы знаходзілі паразуменне. Мне бачылася, што пытанні нарады ў большай ступені адносяцца да кампетэнцыі дзяржаўных органаў і ў меншай — да Савета рэктараў.

Я выступіў з дакладам, які ўтрымліваў прапановы па рашэнні ўказаных праблем. Сваімі меркаваннямі падзяліліся А. А. Тозік і А. М. Рубінаў, пасля чаго я прапанаваў рэктарам абмяняцца меркаваннямі. Пасля двух выступленняў калег слова папрасіў А. У. Казулін. Мне цяжка сказаць, чаму, але ён у сваім выступленні нечакана для ўсіх не падтрымаў прапановы міністэрства, пры гэтым не стрымаўся і нагаварыў рэзкіх слоў у адрас Анатоля Афанасьевіча і Анатоля Мікалаевіча. Уладзімір Мікалаевіч мне потым сказаў, што пасля выступлення Аляксандра Уладзіслававіча ўсе, у тым ліку і сам Шымаў, чакалі маіх пярэчанняў як старшыні нарады, а я спакойна падзякаваў Казуліну за выступленне і даў слова наступнаму рэктару, чым поўнасцю і абяззброіў старшыню Савета рэктараў.

Гэтая нарада яшчэ болей зблізіла мяне з рэктарам Шымавым. Мне першапачаткова надзвычай карыснымі былі яго кансультацыі па эканоміцы функцыянавання сістэмы адукацыі. Мы пашыралі сферу паслуг, вялі маштабнае будаўніцтва, у нашай сістэме працавалі прамысловыя прадпрыемствы для вытворчасці сістэм глыбіннай разведкі карысных выкапняў, адлўкі шматтонных чыгунных цюбінгаў для будаўніцтва метро, вырошчвання штучных алмазаў, адлўкі золата з металічнага лому і шмат што іншае.

Як гэтыя прадпрыемствы аказаліся ў сістэме адукацыі, разбірацца не было часу — трэба было выконваць вытворчыя планы, пашыраць і ўдасканальваць тэхналогіі, шукаць рынкі продажу, выплачваць рабочым заробак, і без дапамогі рэктара эканамічнага ўніверсітэта, былога члена ўрада, мне ніяк было не абысціся. І я часта запрашаў яго па гэтых пытаннях да сябе ў міністэрства і сам у яго ва ўніверсітэце прыжыўся. За гэты час я ўбачыў, з якой павагай да Уладзіміра Мікалаевіча адносіцца работнікі міністэрства і ўсе рэктары.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 3 верасня.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня, 13 жніўня, 20 жніўня.)*

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 70 (596)

Віншуем пераможцаў!

# КАЛІ КЛАСІКА АЖЫВАЕ

## Адбыўся фінал рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў

**Ужо ў пачатку верасня аматары з розных куточкаў Беларусі наведаюць Добруш, каб разам адсвяткаваць Дзень беларускага пісьменства. У межах фестывалю традыцыйна ладзіцца рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка», падвядзенне вынікаў якога прымяркоўваецца да свята. У гэтым годзе ўдзельнікамі тварчых чытанняў сталі 15 тысяч школьнікаў. Але ў фінал, які адбыўся 23 жніўня, трапіла толькі 15 чалавек.**




Асноўная мэта конкурсу — запаліць у дзецях цікавасць да літаратуры. Удзельнікам можа стаць кожны, але, каб стаць фіналістам, неабходна прайсці некалькі этапаў: спачатку прачытаць абраны верш лепей, чым астатнія школьнікі раёна, далей перамагчы на абласным этапе, і толькі потым канкурсанта чакае фінальны іспыт. Тэма конкурсу сёлета — «Гістарычны каляндар»: удзельнікі пагарталі старонкі айчыннай літаратуры і звярнуліся да розных этапаў нашай гісторыі. У Год гістарычнай памяці згадалі вершы творцаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны, асобы класікаў — Янкі Купалы і Якуба Коласа, чый 140-гадовы юбілей з дня нараджэння мы ў гэтым годзе святкуем, а таксама іншых вядомых паэтаў Беларусі. Як адзначыў **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Беларусі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ**, асноўным у конкурсе з'яўляецца выбар тэмы і аўтара, а каб зразумець верш, «трапіць» у яго, трэба адчуць твор сэрцам і душой.

Праект ладзіцца Міністэрствам інфармацыі і Саюзам пісьменнікаў Беларусі сумесна з тэлеканалам «Сталічнае тэлебачанне». Таму фіналісты, акрамя прызоў, атрымліваюць магчымасць з'явіцца на экранах. **Дырэктар дырэкцыі спецпраектаў СТБ Ірына ПЕРАДНЯ** падкрэсліла, што практычна ўсе нумары былі прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны, бараўцьбы з нацызмам і гістарычнай памяці.

Пераможцаў абіралі ў чатырох узроставых катэгорыях. Па словах канкурсантаў, самым складаным для іх было не толькі абраць верш, але і паглыбіцца ў яго сутнасць, перажыць тыя ж самыя эмоцыі, якія адчуваў аўтар падчас напісання. Ва ўзроставай катэгорыі 1—4 класы І месца заваяваў Радзівон Дземянчук з Брэсцкага дзяржаўнага абласнога цэнтра маладзёжнай творчасці, ва ўзроставай катэгорыі 5—6 класы найлепшай стала Паліна Пінчук з гімназіі горада Петрыкава. Ва ўзроставай катэгорыі 7—8 класы перамогцаў аказалася двое — Марыя Наско з сярэдняй школы № 2 г. Докшыцы і Уладзіслаў Смелаў з Губіцкай базавай школы Буда-Кашалёўскага раёна. Сярод старэйшых удзельнікаў, навучэнцаў 9—10 класаў, лідар — Максім Губанаў з сярэдняй школы № 2 г. Стоўбцы.

Тэлеверсію фіналу конкурсу «Жывая класіка» можна будзе паглядзець на тэлеканале СТБ 4 верасня ў 16.55.

Арына КАРПОВІЧ.

Не праходзьце міма

# Музеі запрашаюць... на ўрокі

## Якія іх праекты могуць зацікавіць школьнікаў

**Ужо лічаныя дні засталіся да пачатку новага навучальнага года. А значыць дзеці, студэнты зусім хутка зноў сустрэнуцца з настаўнікамі, сябрамі і пачнуць альбо працягнуць спазнаваць новае. Незвычайныя ўрокі ў новым навучальным годзе можна правесці не толькі ў класах, але і ў музеях, якія падрыхтавалі для школьнікаў свае цікавосткі.**

### Адкрыты ўрок у Мастацкім музеі

Старт новаму навучальному году ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея дадуць сёння. З 12 да 17 гадзін тут запланавалі вельмі насычаную праграму на любы густ і ўзрост. У раскладзе «ўрокаў» — квэст «Мінск у Музеі», які пазнаёміць з мастацкімі творамі, што адлюстроўваюць жыццё горада, «Арт-лабараторыя» дазволіць самым юным наведвальнікам «пахімічыць». На «Астраноміі» ўсіх прысутных чакае падарожжа ў свет твораў Язэпа Драздовіча. Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі дорыць цэлую праграму: майстар-клас па скульптуры, канцэрт-гульня «Грані нашых талентаў», пошук «Творчай шпаргалкі блогера» — каб раскрыць акцёрскі патэнцыял.

— Мерапрыемства такога фармату ў нас праводзіцца ўжо не першы раз, апрабавалі яго ў 2019 годзе, і гэта знайшло водгук сярод нашых наведвальнікаў. Але з-за пандэміі давялося працу часова спыніць, і два гады мы нічога не праводзілі. А сёлета вырашылі зноў адрадзіць праграму, надаўшы ёй свайго роду фестывальнае «гучанне», дзе будуць і канцэрты, і майстар-класы, і шмат іншых цікавых занятаў, — адзначае **старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Алена МАШЧОНАК**. — Мерапрыемствы ў нас прысвечана пачатку новага навучальнага года, таму мы вырашылі запрасіць дзяцей на пазашкольныя ўрокі ў музей. І тым самым прадэманстраваць ім, што адукацыя бывае рознай — творчай, акадэмічнай, мастацкай і можа быць у радасць. А паколькі мінулым разам да нас завітала пераважна сямейная аўдыторыя, то гэтым разам ставілі мэту зацікавіць наведвальнікаў самых розных узростаў. Так у выніку і атрымалася насычаная праграма, дзе занятак па душы знойдзецца як для самых маленькіх, так і для старэйшых школьнікаў і нават для іх бацькоў.

Вядома, не абыдзецца і без цікавых лекцый, разлічаных на больш дарослую аўдыторыю. Дызайнер Наталля Кастрама раскажа пра тое, дзе шукаюць натхненне беларускія мадэльеры, графічны дызайнер Аляксандра Стэльмашонак — пра «Новую шчырасць каліграфіі» і яе існаванне ў сучасных умовах. Пасля лекцыі ў кампаніі філолага і педагога Іны Хазеевай можна будзе дапамагчы дзецям скласці іх уласную прафесійную траекторыю. Адметна, што на вялікім перапынку ўсіх чакаюць праглядны кіно і мультфільмаў, а па выніках мерапрыемства ўдзельнікі атрымаюць падарункі. Наведацца ў такую школу варта. Адзінае — папярэдне зазірніце на сайт музея, каб даведацца ўсе дэталі будучага візіту.

### Шлях у стагоддзе і таямніцы — у Гістарычным музеі

Тут варта звярнуць увагу адразу на некалькі праектаў. Выставачны праект «Лёс музея — лёс краіны. Шлях працягласцю ў стагоддзе» распавядзе юным наведвальнікам, як стваряўся музей, пазнаёміць не толькі з унікальнымі экспанатамі, але і з людзьмі, адказнымі за іх захаванне.


Фота з архіва Мастацкага музея.

А вось выстаўка «Таямніцы беларускага пісьменства» — гэта знаёмства з калекцыяй знаходак лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне», аўтара праекта «У пошуках страчанага» Уладзіміра Ліхадзедава. Магчымасць перанесціся ў часе і даведацца (а можа, і пасапраўднаму здзівіцца), чым пісалі раней, які выгляд мелі алоўкі, чарнільніцы, нажы для паперы, што бралі з сабой з гэтых прылад у вандроўкі і на якую прадукцыю ў канцылярскіх крамах быў найбольшы попыт. Асаблівую цікавасць выклікаюць экспанаты з гісторыяй, якія звязаны з імёнамі такіх славутых людзей, як князі Радзівілы, кампазітар Станіслаў Манюшка, браты Тышкевічы і іншых.

Выставачны праект «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры» зацікавіць юных наведвальнікаў інтэрактыўнымі элементамі, магчымасцю дакрануцца да беларускай гісторыі.

### Адчуць сталічныя матывы ў Нацыяналцы

Далучыць школьнікаў да гісторыі беларускай сталіцы дазволіць кніжная выстаўка «Гарадскія матывы», прымеркаваная да Дня горада Мінска (адзначаецца ў другую суботу верасня). Сталіца Беларусі — адзін са старажытных гарадоў Еўропы, які зведаў цану разбурэнняў і аднаўлення, які стала магчымым дзякуючы намаганням гараджан. Сёлета Мінск адзначыць сваё 955-годзе з моманту першага згадвання ў «Аповесці мінулых гадоў». А сучасны горад — гэта ўжо светлая паэма з камення і шкла, з дамамі, паркамі, дыванамі газонаў і кветак. І, як любы мегаполіс, ён мае свае рытм, настрой і душу. Таму і святочная выстава падзелена на некалькі раздзелаў. Так, «Сведкі далёкай даўніны» не толькі распавядаюць пра гісторыю мінулага сталіцы з дапамогай кніг і фотаздымкаў, але і дэманструюць разнастайнасць гістарычных крыніц, якія мае ў сваіх фондах НББ. Паўнавартаснае ўяўленне аб асаблівасцях Мінска (яго храмах, плошчах, тэатрах і г. д.) даюць арыгінальныя паштоўкі канца XIX — пачатку XX стагоддзяў. Разыначкай раздзела «Шпацыр па галоўнай плошчы» стала выданне «Галоўная вуліца Мінска», якое захоўвае гісторыі дамоў праспекта Незалежнасці, людзей, якія там жылі і стваралі. У заключным раздзеле «Горад любові ў аб'ектыве фотакамер» сабраны юбілейныя, навукова-папулярныя і мастацкія выданні, а таксама багата ілюстраваныя альбомы.

— Мінчане — асноўныя наведвальнікі Нацыянальнай бібліятэкі. Выстава «Гарадскія матывы» адкрылася крыху раней, чым мы будзем святкаваць юбілей горада, і задае настрой на святкаванне, — распавядае **Надзея КРАСУЦКАЯ, вядучы метадыст аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці НББ.** — Мабыць, упершыню мы паказалі не толькі гісторыю горада, але і вылучылі яго галоўную магістраль — праспект Незалежнасці. Паказалі мінчан і гасцей сталіцы ў імгненнях, кожнае з якіх па-свойму непаўторнае. Яны былі схоплены фотакамерамі прафесійных фатографаў, а пасля з'явіліся ў альбомах, прысвечаных Мінску. Увогуле, большасць альбомаў пра сталіцу ўтрымліваюць фотаздымкі архітэктуры, цікавых месцаў, але там амаль няма людзей. А ў нас атрымалася знайсці такія крыніцы, дзе раскрыта ў тым ліку і прыгажосць жыхароў і гасцей нашага горада. Таксама хачу звярнуць увагу на раздзел, прысвечаны гісторыі Мінска, якую мы раскрываем праз выданні нашага фонду. Пачынаем з цікавага тома — «Аповесць мінулых гадоў» па Лаўрэнцьеўскім спісе. Яно з'яўляецца факсімільнай копіяй 1872 года старажытнага рукапіснага тэксту. Менавіта ў гэтым помніку Мінск упершыню згадваецца як крэпасць Полацкага княства ў сувязі з міжусобнай бітвай на Нямізе ў 1067 годзе. Ёсць яшчэ адно выданне, якое я хацела б вылучыць, — гэта «Збор старажытных грамат і актаў гарадоў Мінскай губерні праваслаўных манастыроў, цэркваў і па розных прадметах» (1848 г.). На форзацы гэтай кнігі — экслібрыс Караля Чапскага, які пэўны час з'яўляўся гарадскім галавой і многае зрабіў для Мінска. А сярод старадаўніх паштовак ёсць выява праекта электрычнага трамвая. Адным словам, выстава дазваляе прыгадаць значныя перыяды гісторыі горада і ўбачыць яго сённяшняе вірлівае жыццё.

### Знаёмства з героямі ў Музеі гісторыі ВАВ

Выдатны ўрок гісторыі і патрыятызму для школьнікаў — наведванне ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны часовай экспазіцыі «Партызанскія кіраўнікі Беларусі». Нагода — 120-годдзе з дня нараджэння дзяржаўных дзеячаў БССР, арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны П. К. Панамарэнкі, П. З. Калініна, Героя Савецкага Саюза І. П. Кажара, Е. І. Барыкіна і 110-годдзе з дня нараджэння Б. А. Булата. Усе гэтыя людзі зрабілі вялікі ўклад у развіццё народнай барацьбы ў тыле ворага супраць гітлераўскіх захопнікаў. А пасля вайны яны апынуліся на адказных пастах дзяржаўнага кіравання, дзе трэба было вырашаць задачу пасляваеннага аднаўлення краіны і яе вяртання да мірнага жыцця... Паспець пазнаёміцца з экспазіцыяй, дзе прадстаўлены фотаздымкі і дакументы аб дзейнасці кіраўнікоў партызанскага руху Беларусі, а таксама прадметы выяўленчага мастацтва, плакаты і асабістыя рэчы юбіляраў, можна да 5 верасня.

Алена ДРАПКО.

Нясумнае чытанне

# «ВА ЎСЁЙ СВАЁЙ ТАЕМНАСЦІ І БЯЗМЕЖНАСЦІ»

## Якімі кнігамі зачытваліся літаратурныя героі?

**Заканчваецца лета, заканчваюцца канікулы, заканчваюцца адпачынкі настаўнікаў... Хутка адсвяткуем Дзень ведаў і Дзень беларускага пісьменства. Галоўны сімвал гэтых свят, зразумела, — кніга... А стваральнікі кніг, пісьменнікі, самі і галоўныя кнігачэі. Таму і персанажы іх чытаюць шмат. Аўтары з дапамогай чытання сваіх герояў яшчэ і мастацкія задачы вырашаюць. Напрыклад, калі створаны Франкенштэйнам монстр у рамане Мэры Шэлі чытае «Пакуты юнага Вертэра», мы разумеем: монстр гэты з пяшчотнай душой і марыць, каб яго пакахалі.**
**Давайце ж паглядзім, што чыталі героі беларускай літаратуры.**

### «І ВОСКУ З ЛАДАНАМ ПРЫЕМНЫ ПАХ ПАЧУЎ...»

Максім Багдановіч нездарма называў сябе часам Максімам Кніжнікам. Ён чытаў вельмі шмат, і не толькі сучаснай яму літаратуры... Пра што сведчыць хаця б верш «Кніга», напісаны ў 1912-м годзе.

*«Псалтыр, пакрытую няжорсткай,*
*бурай кожай,*
*Я ўзяў і срэбныя засцёжкі адамкнуў,*
*Перачытаў радкі кірыліцы прыгожай*
*І воску з ладанам прыемны пах пачуў.*
*Вось псальма слічная.*
*«Як той алень шукае*
*Крыніцы чыстай, так шукаю Бога я».*
*Як вее свежасцю яе краса жывая!*
*Як радасна далей спяшыць душа мая!*
*І бачу я ў канцы няхітрую прыпіску,*
*Што «кнігу гэтую раб божы, дзяк Гапон,*
*Дзеля душы спісаў у месце Ваўкавыску*
*У рок сем тысяч сто васьмы*
*з пачатку дзён».*



Згадзіцеся, падобна, што аўтар трымаў гэтую кнігу ў руках... Верш Максім Багдановіч напісаў пад уражаннем наведвання Беларускага музея ў Вільні, дзе захоўвалася багата рукапісных кніг. Праўда, хаця ўсе прыведзеныя паэтам дэталі праўдападобныя, дакладна такой кнігі, спісанай у Ваўкавыску дзякам Гапонам, навукоўцы не адшукалі. Але «Псалтыр» — сапраўды кніга, вартая заняць першае месца ў віртуальнай бібліятэцы.

### «І Ў ТОЙ ЖА ЧАС ПА-БЕЛАРУСКУ ЦІХАЯ»

Не заўсёды, праўда, згадка ў літаратурным творы чужога твора паважлівая... Напрыклад, у рамане Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» згадваецца экспанат з музея вёскі Шапялёўка: зборнік вершаў XVII ст. «Ён і яна». Падаецца той зборнік у пераліку з «цікавым рукапісамі XV стагоддзя «Аб гаспадарчым выхаванні жывёлы» і «Дзённікам абжэрства (XVI ст.)». Гэты зборнік вершаў «Ён і яна» насамрэч — паэма Янкі Купалы «Яна і я». Напісаў яе Купала ў 1913 годзе пад уплывам прачытання этнаграфічных зборнікаў, на першай старонцы рукапісу — загаловак «Яна і я» (Песня), або 66 і яшчэ 6 песень.




Ад песні да песні». У паэме, дзе ўслаўляецца сялянскі каляндарны цыкл, угледжваецца паралель з «Песняй песняў» Саламона. Патрыярхальнае жыццё, праца на зямлі... «Паэма выключна своеасаблівая, зямная, паганская і ў той жа час па-беларуску ціхая, акварэльная і зноў, і зноў мужыцкая», — пісаў Фадзееў. А вось маладыя літаратары палічылі твор састарэлым. Вось і прылічыў яе здзекліва Андрэй Мрый да XVII стагоддзя... Таму паспрабуйце перачытаць паэму і ацаніць самі.

### «ЛЕВАЙ РУКОЙ ПРАВАЕ ВУХА ЦЕРАЗ ГАЛАВУ ЧУХАЕ»

Уладзімір Караткевіч быў аматарам інтэлектуальнай гульні з чытачом. Ён зрабіў тое ж, што пазней зробіць Мілорад Павіч у сваёй «Скрыні для пісьмовых прыналежнасцяў», героі якой чытаюць Павічаўскі ж «Хазарскі слоўнік». У рамане «Чорны замак Альшанскі» Караткевіча героі абмяркоўваюць раманы... самога Караткевіча.

«Шаблыку гэтая бяседа была такая цікавая, што здохнуў бы разам з мухамі. Таму размова перайшла на тэму, ад якой, мяркуючы па нашых літаратурных газетах, здохлі б мухі ўва ўсім свеце: на «кніжнасць».

— Ну вось якой ты, Міхась, думкі пра Быкава?

— А нічога. Не выдумляе. Відаць, што сербануў гэтай ваеннай раскошы аж пад пілотку. Не тое што нейкі піша, як Саня лазенным венікам роту немцаў разагнаў... з танкамі.

Мылі, мылі костачкі інжынерам чалавечых душ (пачулі б яны гэта з трыбуны), і скончылася размова яшчэ на адной асобе, да якой я ўвогуле стаўлюся цярпіма:

— Ну а гэты... Караткевіч? — спытаў Шаблыка.

— А нішто сабе. Толькі чмывы нейкі, дурашны. Левай рукой правае вуха цераз галаву чухае... Ніколі не ведаеш, чаго ад яго чакаць».

### «МЯНЕ ТЫ ТАДЫ ЙШЧЭ ЗАЎВАЖЫЎ, МОЙ СОКАЛ...»

Сваёй улюбёнай гераіні Паўлінцы Янка Купала таксама дае ў рукі кніжку... Праўда, не зусім звычайным чынам. Да прыгажуні Паўлінкі прыходзіць у госці яе каханы, настаўнік Якім Сарока, скарыстаўшыся тым, што бацькі дзяўчыны з'ехалі на кірмаш.

«Паўлінка (садзячыся за шыццё). Але смела будзь, як у Бога пад прыпечкам. Паехалі абое на торг і, пэўна, позна вернуцца, бо маюць трохі сяготага да прадання і маняцца сякіятакія зрабіць пакупкі. Бачыш, заўтра мае быць трохі гасцей з кірмашу. (Абнімае Якіма, раптам знаходзіць у кішэні кнігу.) А гэта што? (Чытае няўмела першыя радкі з «Песні аб Сокале» М. Горкага. Потым ён забірае ў яе кнігу і сам чытае.)»

Нагадаю першыя радкі таго твора: «Море — огромное, лениво вздыхающее у берега, — уснуло и неподвижно в дали, облитой голубым сиянием луны. Мягкое и серебристое, оно слилось там с синим южным небом и крепко спит, отражая в себе прозрачную ткань перистых облаков, неподвижных и не скрывающих собою золотых узоров звезд».

Зразумела, чытаць Горкага Паўлінка павінна была, каб глядач зразумеў, што Якім — рэвалюцыянер. Вось толькі радкі тыя занадта лірычныя. Таму ў пэўны час воляю ржэсёраў Паўлінка чытала іншы твор Горкага — «Буравеснік» і невыпадкова кнігу знаходзіла, а Якім нібыта па яе просьбе крамолу ёй прынёс. Часам эпізод з чытаннем Горкага ўвогуле са спектакля прыбіраюць. А вось Купала вобраз горкаўскага сокала лічыў знакавым і на смерць Горкага пісаў: «Праспяваў сваю песню аб сокале, Скалыхнуў белы свет буравеснікам», «Мяне ты тады йшчэ заўважыў, мой сокал, Калі была цемра і жудасць навокал».

### «ГЭТАЙ БАСНІ ПРЫПОМНІЦЬ НЕ МОЖНА, ДУЖА ЦЯЖКАЯ»

Герой цудоўнага твору Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях», студэнт, прыязджае пагасцяваць да свайго дзядзечкі, аматара дзівосных гісторый. Вось дзядзечка і давай прасіць вучонага пляменніка:

«— Ты чалавек вучоны, хадзіў у езуіцкую школу, чытаў многа кніжак, гутарыў з вучонымі людзьмі, павінен ведаць шмат разнастайных гісторый, сёння ўвечары распавядзі мне што-небудзь цікавае».

Пачаў хлопец прыпамінаць, чым бы пахваліцца, ды нічога не чытаў, апрача гісторыкаў і класікаў. І вырашыў пачаць з «Адысеі» Гамера, «бо ў гэтай паэме поўна чараў і дзіваў, як і ў нашых простанародных аповесцях».

Вось увечары сабраліся ўсе паслухаць вучонага паніча... Той, каб гісторыя была зразумелай, кароценька распавёў пра самых галоўных грэчаскіх багоў, багінь і герояў, пад рэплікі «Гэтай басні прыпомніць не можна, дужа цяжкая». Тым не менш цытаванне «Адысеі» працягнулася да апоўначы...

«У час майго побыту ў дзядзькавым доме мусіў я амаль пяць тыдняў кожную ноч усыпляць яго пераказам славутых паэм грэчаскіх або лацінскіх класікаў, аднак найбольш яму падабалася з «Адысеі» мудрасць Уліса на берагах Цырцэі і на востраве цыклопаў. Паўтараў мне не раз:

— А можа, некалі даўно і бывалі такія агромністыя веліканы, толькі дзіўна, што з адным вокам на лбе. Але ж і хітрун гэты Уліс — напаіў, выкалаў вока і выехаў на баране.

Не мог таксама ён забыць шостай песні з Вергілія, дзе Эней увайшоў у пекла. Паўтараў некалькі разоў такія словы:

— Хоць ён быў і паганін, ды якое шляхетнае пачуццё і любасць да бацькі — ісці ў такое небяспечнае месца. Але якая ў іх дзіўная вера, у нас душачкі збавёныя ідуць у неба, а яны сабе прыдумалі нябеснае валадарства так глыбока пад зямлёй. Дзіўная рэч!»



### «ГЭТА БЯЗМЕЖНАСЦЬ ЗАЦІРАЛА ЗЯМЛЮ»

Раман «На ростанях» Якуб Колас пісаў пра сябе, і галоўны герой, малады настаўнік Лабановіч — гэта і ёсць малады Канстанцін Міцкевіч, які пакутліва шукае свой шлях і разважае над сэнсам жыцця.

«Гадзіннік прабіў поўнач. Настаўнік перанёс лямпу ў другі, яшчэ меншы, пакоік, дзе стаяў яго просценькі дзервяны ложак, лёг у пасцелю і чытаў «Зорныя светы і іх насельнікі».

Кніга робіць на героя вялікае ўражанне.

«Шырокі малюнак недасяжных светаў раскрываўся перад вачамі маладога настаўніка ва ўсёй сваёй таемнасці і бязмежнасці. І чым больш мысль захоплівалася гэтым чароўным малюнкам і гэтымі незлічонымі светамі, раскіданымі сярод бяздонных багнаў, такіх страшных, такіх павабных, — зямля і чалавек, пагардлівы гаспадар яе, рабіліся ўсё меней і меней значнымі, нікчэмнымі. Гэта бязмежнасць зацірала зямлю, і яна гублялася ў ёй, як малюсенечкая пылінка. А які малазначным, непрыметным з'яўляўся чалавек, яго клопат, яго штодзённыя драбніцы жыцця! Новыя думкі і настроі ахінулі маладога настаўніка. Але гэтыя думкі ў момант разляцеліся, як вераб'і, калі ў іх вясёлы гурток паляціць каменьчык, кінуты рукою якога-небудзь падшывальца-жэўжыка; страшны і непрыемны вобраз смерці бліснуў сярод гэтых думак маладога настаўніка і разагнаў іх. На адзін момант жыццё ў ім як бы спынілася. Па яго целе прабегла дрыготка, бо гэты вобраз смерці вынік зусім неспадзявана.

«Я памру! — падумаў малады настаўнік. — Будзе такі час, калі я стану нежывым, трупам!»

На кароткі міг ён як бы адлучыўся ад сябе самога і зірнуў на сябе збоку, як староннí, другі чалавек, і жыва ўявіў сабе той момант, калі ён будзе нерухомым трупам».

Лабановіч доўга разважае на гэтую тэму... А кніга цалкам рэальная — гэта брашура вядомага астранома прафесара Іосіфа Пале «Звездные миры и их обитатели. Введение в современную астрономию», якая выйшла ў 1903 годзе ў Санкт-Пецярбургу як бясплатны дадатак да часопіса «Вестник и библиотека самообразования». Напэўна, Якуб Колас якраз гэтае выданне і меў. Французскі астраном у ім разважае пра магчымасць жыцця на іншых планетах.

### ЛАСІНЫЯ ГУБЫ Ў ВОЦАЦЕ

Дзеянне аповесці Адама Мальдзіса «Восень пасярод вясны» адбываецца ў XIX стагоддзі, сярод галоўных герояў — паэт Уладзіслаў Сыракомля і яго каханая, актрыса Гелена Маеўская. Чытач трапляе ў свецкія салоны, дзе часам можна пачуць і такое:

«— О, то я панству лепей раскажу, як акрэсліць, колькі карове год, — узрадаваўся магчымасці Дайнаровіч. — Нічога прасцейшага. Ад кожнага цяляці на рагах паяўляецца па колцу. Варта глянуць на рогі — і падлічыць колцы.

— Усё ён ведае, усё помніць! — з захапленнем шапнула пра Дайнаровіча Янінка.

— Супакойцеся, міленькая, — ціха адказаў Сыракомля. — Свае парады ён проста вычытаў у кнізе «Гаспадыня літоўская» пані Гарватовай з Мінска. Аўтарка на кнізе не абазначана, але ўсе здагадваюцца, хто яе напісаў».

Адам Мальдзіс не дарэмна згадвае кнігу «Гаспадыня літоўская». Менавіта Адам Мальдзіс знайшоў яе, уразіўся сакавітасці, атмасфернасці і беларускасці, і ўсяляк прапагандаваў. Адтуль Уладзімір Караткевіч браў каларытныя дэталі, накшталт блакітнага ліквору і ласіных губ у воцаце. Доўга вяліся спрэчкі наконт асобы аўтаркі, той жа Мальдзіс давёў, што яе звалі не «пані Горватава», а Ганна Цюндзявіцкая. І на сёння «Гаспадыня літоўская» — папулярнае чытво. Рэцэпты, якія там прыводзяцца, і гаспадарчыя парады часам гучаць як мастацкія творы.

Так што густы літаратурных герояў могуць супасці і з вашымі, шаноўныя чытачы. Самы час зацікавіцца беларускай літаратурай.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

28 сентября 2022 г. № 8-Н/2022

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении аукционных торгов по продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение/ срок аренды | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, ул. Красный Маяк, 109 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 3 августа 2121 года | 340100000008002663 0,0741 га | **12 605,55** | **1 200,00** | **4 011,09** | зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, обременения – в связи с размещением на земельном участке фундамента, нежилого сооружения неустановленного назначения (сарай), присутствуют следы проведения земляных работ |
| 2 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-625 (по генплану) | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 3 августа 2121 года | 340100000008002940 0,0810 га | **3 483,48** | **300,00** | **4 097,26** | зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, обременения – в связи с размещением на земельном участке фундамента, присутствием следов земляных общестроительных работ |
| 3 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-2423 (по генплану) | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ аренда сроком по 3 августа 2121 года | 340100000008004475 0,0810 га | **7 214,26** | **700,00** | **4 306,75** | зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения – в связи с размещением на земельном участке фундамента, присутствием строительных материалов и строительного мусор |
| 4 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-1784 (по генплану) ул. Каскадная, 14 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000008004072 0,0789 га | **49 637,65** | **4 900,00** | **3 798,77** | зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с присутствием на земельном участке незавершенного капитального сооружения |
| 5 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2329 (по генплану) | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000008004288 0,0810 га | **17 500,59** | **1 700,00** | **3 786,44** | зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения – наличие фундамента, капитального сооружения неустановленного назначения, следов земляных работ |
| 6 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2372 (по генплану) | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000008004298 0,0871 га | **33 442,15** | **3 300,00** | **3 892,75** | зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения – присутствие фундамента, строительного мусора, капитального незавершенного строительством сооружения |
| 7 | не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2435 (по генплану) | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000008004525 0,0810 га | **23 065,10** | **2 300,00** | **3 910,37** | зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы. Обременения – наличие фундамента, капитального сооружения неустановленного назначения, следов земляных работ |
| 8 | не завершенный строительством жилой дом ул. Старобелицкая, 16 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000006004714 0,1112 га | **6 616,12** | **660,00** | **2 499,96** | ограничений в использовании не имеет. Обременения в связи с размещением на земельном участке дикорастущей древесно-кустарниковой растительности |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»)

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов» на земельном участке в г. Гомель, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 28 сентября 2022 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.**

**Перечень документов, представляемых участником:**

4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, п**редставителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

4.2 представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1 в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;
- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;
- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;
- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

6.2 После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка;

6.3 Гомельским горисполкомом может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

**7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 26 августа по 26 сентября 2022 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Контактный телефон +375 232 30-12-46.**

**Информация размещена на сайте: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by газета «Звязда», «Гомельские ведомости»**

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 29.09.2022 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-12628, общей площадью 324,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Горочичский с/с, д. Бобровичи, ул. Лесная, 6. Назначение: здание склада; наименование: здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 322381200601000028 площадью 0,0445 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 53 827,20 бел. руб., задаток – 5 382,72 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-44290, общей площадью 2 427,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Лейтенанта Рябцева, 44Е. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: бытовой комплекс. Составные части и принадлежности: подвал, пристройка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001019176 площадью 0,3447 га (право постоянного пользования). *Объект является предметом обеспечения по договору ипотеки. В отношении части капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 368 640,00 бел. руб., задаток – 36 864,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Объект недвижимого имущества в составе:

жилой дом с инвентарным номером 333/С, общей площадью жилых помещений (согласно ведомости технических характеристик, составленной по состоянию на 28.09.2021) 297,4 кв. м) и примыкающие к нему хозяйственно-бытовые постройки, расположенные по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14. Назначение: здание одноквартирного жилого дома. (Объект не принят в эксплуатацию).

Земельный участок с кадастровым номером 322350100003004175 площадью 0,1024 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14.

**Начальная цена продажи – 103 654, 64 бел. руб., задаток – 10 365,46 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Земельный участок с кадастровым номером 623883000043000051 площадью 0,1020 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Ветеран-7», У-68. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 6 619,80 бел. руб., задаток – 661,98 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000155 площадью 0,0396 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 716, 76 бел. руб., задаток – 71,68 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000154 площадью 0,0400 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 724,00 бел. руб., задаток – 72,40 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166724 общей площадью 507,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/3. Назначение: здание многофункциональное; наименование: мастерские. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 153 090,00 бел. руб., задаток – 15 309,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166722 общей площадью 209,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/5. Назначение: здание многофункциональное; наименование: мастерские. Составные части и принадлежности: одна пристройка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 64 800,00 бел. руб., задаток – 6 480,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223868 общей площадью 41,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/6. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: домик из комплекта. Составные части и принадлежности: А1/сп-домик из комплекта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 14 661,00 бел. руб., задаток – 1 466,10 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-54625 общей площадью 2143,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Мира, 21а. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание центра спорта и отдыха. Составные части: двухэтажное каменное здание центра спорта и отдыха с подвалом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003005083 площадью 0,5748 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 3 700 800,00 бел. руб., задаток – 370 080,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-37430 общей площадью 403,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Верхнеолбянский с/с, 9/4, здание механических мастерских. Назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование – здание механических мастерских. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание механических мастерских с ограждением. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321880400001000005 площадью 4,0359 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 24 336,00 бел. руб., задаток – 2 433,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-15416 общей площадью 160,00 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Геологическая, д. 87. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: литер И 1/к, здание растворного узла. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000001034906 площадью 0,7376 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 88 992,00 бел. руб., задаток – 8 899,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-49381 общей площадью 19,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Красноармейская, 53а-6. Назначение: помещение транспортного назначения; наименование: гараж. **Начальная цена продажи – 2 592,00 бел. руб., задаток – 259,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708135095 общей площадью 91,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Мястровская, 5-104. Назначение: квартира; наименование: квартира. **Начальная цена продажи – 397 600,00 бел. руб., задаток – 39 760,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость»

**Аукцион состоится 29.09.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений – 26.09.2022 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X,

ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **29 сентября** 2022 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; + 375 17 266 63 02.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Самы час навесці парадак у сваіх думках і перастаць жадаць цудоўнага выканання немагчымага, а пачаць патрабаваць ад сябе таго, чаго вы цалкам у стане дабіцца самастойна. Захочацца перамен, вызвалення ад усяго, што вас скоўвае, толькі паспрабуйце своечасова спыніцца, не варта падыходзіць блізка да прорвы і спальваць масты, якія вам яшчэ спатрэбяцца.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні сітуацыя на працы будзе складаца ўдала. Вы атрымаеце шанц быць убачанымі і пачутымі. Толькі не забывайце, што вы знаходзіцеся пад увагай, так што трэба паказваць свае таленты, а не капрызы. Неабходна сабрацца з сіламі і прыняць важнае рашэнне, якое паўплывае на ваш далейшы лёс. У асабістым жыцці магчымае расчараванне і разрыў.

**БЛІЗНЯТЫ.** Паўсядзённыя справы будуць ладзіцца, творчыя пачынанні ўвянчаюцца поспехам. З'явіцца магчымасць атрымаць адчувальны прыбытак, пацешаць стасункі ў цікавай кампаніі. Таксама гэты тыдзень спрыяльны для спатканняў, кахання, гарачых прызнанняў. Вы яшчэ раз пераканаецеся, што патрэбны і жаданыя. Ёсць магчымасць зрабіць рывок і дасягнуць таго, чаго даўно хацелі.

**РАК.** На гэтым тыдні адначасова ўзрастуць ваш аўтарытэт, а таксама ролькасць значны будуць і сацыяльны статус, і добрыя адносіны са сваякамі. Узрастае ваша сіла пераканання, якая дапамагае ствараць новыя карысныя сувязі. У аўторак дзейнічайце, зыходзячы з уласных інтарэсаў, іх зразумеюць і ўлічаць. У суботу можаце прыняць важнае рашэнне, якое становіча паўплывае на маральную і матэрыяльную атмасферу ў сям'і.

**ЛЕЎ.** У цэлым тыдзень можа аказацца даволі клапатлівым. У першую чаргу займайцеся абавязковымі справамі, астатнія пакуль адкладзіце. Не крытыкуйце і не абмяркоўвайце дзеянняў кіраўніцтва, калі не жадаеце праблем на працы. У чацвер не ігнаруйце сяброўскіх парад. У каханні не патрабуйце занадта шмат, Месяц з неба вам не дадуць.

**ДЗЕВА.** Вам зараз, падобна, не вельмі шанцуе. І многія вашыя беды — ад стомленасці. Верагодныя канфлікты і зацяжныя высвятленні адносін на працы. Можа востра ўстаць пытанне аб зарплаце і прафесійным росце. Мае сэнс штосьці памяняць, магчыма, кола знаёмстваў, магчыма, імідж. І калі вы яшчэ не былі ў адпачынку, паспрабуйце, нарэшце, яго ўзяць.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні вас можа чакаць творчы ўздым і нечакана ўдалае вырашэнне важных задач, якія патрабуюць узгаднення з вышэйстаячымі інстанцыямі. У панядзелак і аўторак не варта марыць, на гэта не будзе часу. Важна не ўпусціць ініцыятыву і зрабіць крок наперад па кар'ернай лесвіцы. У суботу пацешце сябе стасункамі з сябрамі, а ў нядзелю паспрабуйце атрымаць асалоду ад цішыні і ўтульнасці.

**СКАРПІЁН.** Удачны час. У пачатку тыдня вас чакае вялікі прыбытак, добрыя навіны і прыемная сустрэча. Вам прапануюць працу вашай мары. І застанецца толькі ўзгадніць дэталі і паставіць свае ўмовы. Ваша меркаванне будуць улічваць, аўтарытэт і даходы рэзка ўзрастуць.

**СТРАЛЕЦ.** Паспрабуйце распланаваць увесь тыдзень, магчыма, нялішне будзе нават скласці сабе дакладны графік і спіс спраў. Аўторак — удалы дзень для рэалізацыі смелых задум. У сераду не варта ісці на рызыку, наколькі б вы ні былі ўпэўнены ў выйгрышы. Не выключана, што створыцца сітуацыя, калі найвышэйшую каштоўнасць набудзе ваша самавалоданне. Так што будзьце гатовы ўзяць сябе ў рукі ў патрэбны момант.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні ўдасца знайсці нямала арыгінальных і нечаканых спосабаў выхаду з няпростых сітуацый. Не варта пасаваць перад цяжкасцямі, наадварот — іх пераадоленне прынясе задавальненне. Дух адмаўлення і непрыняцця можа аваладаць вамі. Пастараецеся ўсё ж не ствараць спрэчкі і канфлікты. А вось выхадныя, наадварот, падораць выключна станоўчыя эмоцыі.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні добра было б павучыцца самадысцыпліне. Будзе паспяхова ўдавацца многае ў рабоце, але не ў асабістым жыцці. Там з вамі могуць не лічыцца, вам могуць змяніць і здрадзіць. Не будзьце занадта наіўныя і згодлівыя. У пятніцу правядзіце час з сябрамі. Нядзеля — не самы прыдатны дзень для незнаёмай дзейнасці.

**РЫБЫ.** У пачатку тыдня вас будуць асабліва часта наведваць новыя ідэі, аднак старайцеся не мяняць працу і не кідаць сям'ю, не забывайце, што ад дабра дабра не шукаюць. Звярніцеся па параду: самому будзе цяжка зрабіць правільны выбар. У сярэдзіне тыдня ваша безураўнілівасць можа саслужыць дрэнную службу, будзьце вельмі ўважлівыя, працуючы з дакументамі. У выхадныя дробныя хатнія справы зоймуць большую частку часу.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.12 | 14.04 |
| Віцебск — | 5.55 | 20.05 | 14.10 |
| Магілёў — | 5.59 | 20.02 | 14.03 |
| Гомель — | 5.59 | 19.58 | 13.59 |
| Гродна — | 6.24 | 20.24 | 14.00 |
| Брэст — | 6.28 | 20.24 | 13.56 |

## Месяц

*Маладзік у 11.17. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

**Пр.** *Евы, Еўдакіі, Аляксея, Аркадзя, Мікалая, Уладзіміра, Фёдара, Фядоса.*
**К.** *Монікі, Тодара, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**27 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1860** год — нарадзіўся (в. Станькава, цяпер у Дзяржынскім раёне) Карл Эмерыкавіч Чапскі (Караль Ян Аляксандр), адзін з прадстаўнікоў старажытнага роду Гутэн-Чапскіх. У 1890—1901 гадах — гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, заснаваў электрастанцыю, забрукаваў многія вуліцы.

**1912** год — нарадзіўся Іван Піліпавіч Цітко\u045e, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. З 1941 года — на фронце. У чэрвені 1942-га накіраваны ў варожы тыл. У кастрычніку 1942 — чэрвені 1943-га — камандзір партызанскай брыгады «Жалязняк» Мінскай вобласці. Пасля вайны на партыйнай і гаспадарчай рабоце. Аўтар кнігі «Брыгада Жалязняк».



**1922** год — нарадзіўся (в. Забалацце Уздзенскага раёна) Алесь Махнач, драматург, празаік, публіцыст, заслужаны работнік культуры Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну быў удзельнікам абароны Брэсцкай крэпасці. У пасляваенныя гады працаваў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Аўтар зборнікаў: «П'есы», «Драматычныя мініяцюры» і іншых. Па яго п'есах пастаўлены спектаклі «Шпачаня», «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці». Напісаў музыку і словы песні «Салігорская лірычная». Пісаў нарысы па праблемах экалогіі, краязнаўстве.

У свеце

**1859** год — палкоўнік Эдвін Дрэйк каля амерыканскага горада Тайтацтвіла (штат Пенсільванія) прасвідраваў першую нафтавую свідравіну ў ЗША. Гэта дата лічыцца пачаткам развіцця амерыканскай нафтавай прамысловасці.

**1871** год — нарадзіўся Тэадор Драйзер, амерыканскі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Аўтар раманаў «Тытан», «Стоік», «Амерыканская трагедыя».

**1896** год — нарадзілася Фаіна Раneўская, савецкая актрыса тэатра і кіно; лаўрэат трох Сталінскіх прэмій, народная артыстка СССР. Цікавы факт: аўтарства крылатай фразы з «Падкідыша» «Муля, не нервуй мяне!» аспрэчвае кожная з датычных да гэтага фільма жанчын. У 1964 годзе ў праграме «Кінапанарама» Раneўская расказала гісторыю аб тым, як яна сама асабіста прыдумала гэтую фразу, а пасля эфіру праграмы пасварылася з аўтарам сцэнарыя фільма Агніяй Барто, якая сцвярджала, што гэтую фразу прыдумала менавіта яна. На аўтарства фразы прэтэндавала таксама і Р. Зялёная, якая была суаўтарам сцэнарыя фільма. Фраза «Муля, не нервуй мяне!» усё астатняе жыццё пераследавала актрысу. Так крычалі хлапчукі, убачыўшы яе на вуліцах, гэтую ж фразу першай успаміналі пры знаёмстве з ёй. Нават Л. І. Брэжнеў на ўручэнні ёй у 1976 годзе (у сувязі з 80-годдзем) ордэна Леніна замест прывітання сказаў: «А вось ідзе наша Муля-не-нервуй-мяне!» Раneўская адказала: «Леанід Ільіч, так да мяне звяртаюцца або хлапчукі, або хуліганы!» Генеральны сакратар ЦК КПСС збянтэжыўся і дадаў: «Прабачце, але я Вас вельмі люблю».

**1900** год — у Англіі пачалі рух першыя міжгародніх аўтобусы.

**1919** год — Саўнаркам прыняў дэкрэт аб нацыяналізацыі ўсёй кіна- і фотапрамысловасці Савецкай Расіі. З 1979 года гэтая дата адзначалася як Дзень савецкага кіно.

**1959** год — у СССР прынята пастанова аб узнагароджанні найлепшых выпускнікоў школ залатымі і сярэбранымі медалямі.

Так гаварыў...

**НАПАЛЕОН БАНАПАРТ:**

*«У палітыкі няма сэрца, а ёсць толькі галава».*

## УСМІХНЕМСЯ

**У рэшце рэшт, жанчына заўсёды даб'ецца свайго, і лепш бы мужчыну пры гэтым не супраціўляцца.**

Каханне бывае толькі з першага позірку. Інакш які ў ім сэнс? Навошта прыглядацца паўгода? Што новага ўбачыш?

**Раніца. Панядзелак. Начальнік пытаецца:**

**— У цябе вочы чырвоныя. Піў ці што?**

**— Не! Па працы сумаваў, плакаў!**

У канцы жніўня паветра асаблівае: пахне яшчэ адным страчаным летам.

**Не люблю гасцей: кучу посуду перамый, бардак прыбяры... І гэта яны яшчэ не прыйшлі.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспл. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1863.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12